WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 КАСТРЫЧНІКА 2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 201
(26559)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.



Фота БЕЛТА

## Аляксандр ЛУКАШЭНКА: «ПРЫВАТНЫЯ ЗАБУДОЎШЧЫКІ ПАВІННЫ БУДАВАЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ВЫСОКАДАХОДНАЕ ЖЫЛЛЁ, АЛЕ І НЕСЦІ САЦЫЯЛЬНУЮ НАГРУЗКУ»

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, наведваючы ўчора ў Мінску будуемы жылы раён Каменная Горка.**

Паводле слоў Прэзідэнта, прыватнікі акрамя высокадаходнага жылля павінны будаваць і сацыяльнае, а таксама аб'екты інфраструктуры. Акрамя таго, неабходна ўзяць пад жорсткі кантроль арганізацыі, якія працуюць ужо на будаўнічым рынку. «Тыя з прыватнікаў, хто сёння не працуе ў будаўніцтве, — да пабачэння», — сказаў кіраўнік дзяржавы, маючы на ўвазе неабходнасць разарваць адносіны з тымі прыватнымі будаўнічымі кампаніямі, якія цяпер па розных прычынах спынілі работы.

Аляксандр Лукашэнка асабліва адзначыў абмежаванне прытоку жыхароў у беларускую сталіцу. «Давайце прымаць усялякія рашэнні, каб абмежаваць прыток жыхароў у Мінск, — адзначыў ён. — Нам нельга збіраць у цэнтры ўвесь народ. Ніхто доступ у Мінск не закрывае, але абмяжоўваць прыток людзей трэба і, зыходзячы з гэтага, планаваць будаўніцтва жылля».

Як адзначыў у сваім дакладзе Прэзідэнту выконваючы абавязкі старшыні Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька, калі ў перыяд 2003—2007 гадоў штогадовы прыток людзей з іншых рэгіёнаў у сталіцу складаў 18—19 тыс. чалавек, то цяпер гэты прыток зменшыўся і ў 2009 годзе складзе каля 11 тыс.

Мікалай Ладуцька таксама паведаміў, што гарадскія ўлады апошнім часам сталі адыходзіць ад так званай тэорыі кампактнага горада, якая прадугледжвала знос усіх старых будынкаў і будаўніцтва на іх месцы новых. Гэта перыядычна выклікала нездавальненне сярод грамадзян, асабліва ўладальнікаў прыватных дамоў, якія зносілі. Цяпер гарадскія ўлады падыдуць да гэтай праблемы больш разумна: будуць зносіць толькі старыя дамы і старацца не чапаць параўнальна новыя.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў неабходнасць гаспадарчага падыходу да праблемы. Паводле яго слоў, «людзей душыць не трэба», але грамадзяне таксама павінны з разуменнем ставіцца да планаў па пашырэнні Мінска і стварэнні больш кампактнай забудовы.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў разабрацца з пустуючых жыллём, у першую чаргу ў Мінску.

Аляксандр Лукашэнка лічыць непрымальнай сітуацыю, калі забудоўшчыкі ў чаканні росту цэнаў на жыллё пакідаюць пабудаванае ўжо жыллё пустуючым. Як праінфармаваў кіраўніка дзяржавы памочнік Прэзідэнта — галоўны інспектар па Мінску Анатоль Калінін, у сталіцы па розных прычынах прытрымліваецца каля тысячы кватэр. «З гэтай сітуацыяй неабходна разабрацца», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Як было далажана Прэзідэнту, у Мінску сёння на чарзе маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў стаяць 260 тыс. сем'яў і адзінокіх грамадзян, з іх 60 тыс. не маюць ва ўласнасці ні аднаго квадратнага метра жылля, 110 тыс. — маладыя сем'і. За пяць гадоў аб'ём жыллёвага будаўніцтва ў сталіцы вырас у два разы.

Выконваючы абавязкі мэра Мінска Мікалай Ладуцька адзначыў, што асноўная ўвага ў будучым будзе ўдзяляцца будаўніцтву жылля за межамі Мінска і ў гарадах-спадарожніках. Так, ужо ў 2011 годзе пачнецца актыўнае пракладанне сістэм інфраструктуры за межамі Мінскай кальцавой дарогі. Што датычыцца мікрараёна Каменная Горка, то да 2012 года плануецца завяршыць тут будаўніцтва жылля, а да 2014-га — усіх аб'ектаў сацыяльнай сферы. Разлічваюць, што колькасць жыхароў новага сталічнага мікрараёна складзе каля 70 тыс. чалавек. На сённяшні дзень уведзены ў эксплуатацыю 21 жылы дом, да канца года будзе здадзена 290 тыс. кв.м жылля. Сярэдні кошт 1 кв.м у Каменнай Горцы складае Br1,6 млн.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## УНІЗ ПА БАЦЮХНЕ-САЖЫ І МАТУХНЕ-ВІХРЫ



**Амаль штодня пенсіянер з горада Мсціслава Уладзімір КУРЗАЎ праплывае па 20 і болей кіламетраў. Колішні настаўнік фізкультуры, выйшаўшы на заслужаны адпачынак, захапіўся рыбалкай настолькі моцна, што перамяшчэнне воднымі шляхамі стала для яго нормаю жыцця. А ўсё таму, што побач з горадам ёсць дзве паўнаводныя і багатыя на рыбу рэкі — Сож і Віхра. Спачатку Уладзімір Ільіч едзе на веласіпедзе да месца сплаву. А гэта добры дзясятак кіламетраў па славутых мсціслаўскіх пагорках. Пасля невялікага перадыху ён надзімае гумавую лодку, спускае на ваду, надзейна прымацоўвае на ёй свой веласіпед і настройвае вуды. Астатняе — справа тэхнікі: сачы за цячэннем (рака Віхра даволі хуткаплынная) і правільна карыстайся снасцямі. Уладзімір Ільіч прызнаецца, што акрамя задавальнення даставаць з вады свой улоў, ён штодня «кайфуе» ад навакольнай прыгажосці.**

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

Минский городской центр недвижимости

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

**27 ноября 2009 г. проводит открытый аукцион № 05-А-09 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение цены продажи).
**Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельного участка.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право аренды на 5 лет 9 земельных участков для строительства в г. Минске:

| Лот № | Место расположения земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | S, га | Функциональное назначение предполагаемого объекта строительства | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. | Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | микрорайон Каменная Горка-5 | 500000000006004520 | 0,3119 | Магазин продовольственных товаров (по генплану № 66) | 222 160 950 | 19 994 490 | 3 675 858 | возмещение убытков КУП «УКС Мингорисполкома» в размере 287 222 бел. руб. |
| 2 | пр. Дзержинского | 500000000005005087 | 2,6082 | Многофункциональный торговый и культурно-развлекательный комплекс в составе студенческого жилого комплекса (по генплану № 1, № 7) | 1 942 685 925 | 174 841 730 | 3 115 029 | возмещение потерь сельскохозяйственного производства в сумме 99 080 360 бел. руб. |
| 3 | пр. Дзержинского | 500000000005005086 | 1,7401 | Физкультурно-оздоровительный комплекс с бассейном и мини-аквапарком в составе комплекса «Студенческая деревня» (по генплану № 16) | 1 296 091 500 | 116 648 240 | 2 771 447 | возмещение потерь с/х произв-ва, а также затрат ГПО «Горремавтодор Мингорисполкома» в сумме 168 446 799 бел. руб. |
| 4 | зона отдыха водохранилища «Комсомольское озеро» (парк Победы) | 500000000007004962 | 0,4998 | Парковый историко-туристический центр (по генплану № 160) согласно архитектурному проекту «Реконструкция зоны отдыха водохранилища «Комсомольское озеро» (парка Победы)» | 480 410 775 | 43 236 970 | 2 790 422 | – |
| 5 | пр. Дзержинского в микрорайоне Малиновка-1 | 500000000005005101 | 0,2594 | Объект общественного питания | 191 225 250 | 17 210 270 | 3 031 279 | – |
| 6 | ул. Селицкого – ул. Шабаны | 500000000002007012 | 0,321 | Объект общественного питания типа «Лидо» (№ 44 по генплану) | 163 491 900 | 14 714 270 | 2 443 973 | – |
| 7 | ул. Селицкого – ул. Шабаны | 500000000002007036 | 0,3429 | Дом быта (№ 42 по генплану) | 179 430 540 | 16 148 750 | 2 361 967 | – |
| 8 | ул. Селицкого | 500000000002007013 | 0,8058 | Универмаг (№ 41 по генплану) | 406 568 853 | 36 591 200 | 1 819 786[1] | – |
| 9 | р-н ул. Ротмистрова – ж/д напр. Осиповичи-Орша | 500000000002007095 | 0,1255 | Автомоечный комплекс на 1 пост | 23 850 324 | 2 146 530 | 2 297 341 | – |

*[1]Указанная сумма не содержит расходов по подготовке землеустроительной документации на участок. Общую сумму расходов по подготовке документации для проведения аукциона по лоту № 8 можно будет узнать за 7 рабочих дней до назначенной даты проведения аукциона.*

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **27 ноября 2009 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток** в указанном выше (в таблице) размере, который составляет 9 % от начальной цены заявленного лота (лота с наибольшей стоимостью – в случае участия в торгах по нескольким лотам), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома (задатки по лотам вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

**представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере (без НДС);

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, которому по результатам аукциона в установленном порядке предоставляется земельный участок, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** для участия в аукционе начинается с **10.00 26 октября 2009 года** и заканчивается в **17.00 23 ноября 2009 года.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому выставленному лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются как единственным, подавшим заявление на участие в аукционе) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона (в установленных законодательством случаях – с его участником) договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком может предоставить победителю аукциона рассрочку по внесению платы за предмет аукциона в установленном порядке.

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен, в установленном порядке обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого, по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам, а также приобретения лотовой документации.

В дни и время, указанные в объявлении, размещаемом на информационном стенде (фойе офиса УП «Минский городской центр недвижимости»: г. Минск, ул. К. Маркса, 39), организатором торгов предоставляется транспорт для обеспечения осмотра земельных участков желающими принять участие в аукционе.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. №№ 4, 6.

**Контактные телефоны: + 375 (17) 226 16 72, + 375 (17) 227 40 22.**

**Дополнительная информация** о выставленных на аукцион участках, а также условия участия в торгах и бланки требуемых документов размещены на официальном сайте организатора торгов **www.mgcn.by.**

Минский городской центр недвижимости

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

**27 ноября 2009 г. проводит открытый аукцион с условиями № 05-У-09 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение цены продажи).
**Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитального строения (здания и сооружения) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Минске по 11 земельным участкам, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

| Лот № | Место расположения земельного участка | Площадь земельного участка, га | Функциональное назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Кирова – ул. Свердлова – ул. Ульяновская – ул. Бобруйская | 0,8695 | Жилой дом повышенной комфортности | 642 642 825 | 57 837 850 | 13 793 326 | снос административной и жилой застройки, а также индивидуальных гаражей | 5 701 759 579 |
| 2 | ул. Каховская – ул. Червякова – Сморговский тракт | 1,2581 | Жилой дом повышенной комфортности | 960 682 800 | 86 461 450 | 17 393 613 | снос индивидуальных домовладений | 2 064 820 630 |
| 3 | пер. 2-й Радиаторный, 37 | 0,1278 | 1-2-х квартирный малоэтажный жилой дом повышенной комфортности с приквартирным участком | 84 668 025 | 7 620 120 | 3 681 561 | снос ветхого нежилого строения | 138 360 816 |
| 4 | ул. Толстого – ул. Дружная – ул. Вокзальная | 2,9264 | Многофункциональный общественно-торговый комплекс | 903 354 075 | 81 301 870 | 26 268 469 | 1-3-этажная нежилая застройка | 5 287 112 841 |
| 5 | ул. Солтыса – ул. Ваупшасова | 1,43 | Торговый центр | 1 125 356 850 | 101 282 120 | 7 062 045 | снос индивидуальных домовладений | 386 602 640 |
| 6 | ул. Кольцова – пер. 1-й Кольцова | 0,5066 | Объект многофункционального общественного назначения | 389 945 775 | 35 095 120 | 7 250 718 | снос малоэтажной застройки | 551 646 905 |
| 7 | пр. Дзержинского (согласно ПДП квартал 4) | 4,9729 | Многофункциональный комплекс общественного назначения, (административный, торгово-развлекательный и др.) квартал 4 | 4 560 970 575 | 410 487 350 | 26 055 415 | снос производственных и административных зданий, а также промсооружений | 30 860 282 796 |
| 8 | ул. Радиальная – ул. Омельянюка – ул. Челюскинцев | 6,46 | Многофункциональный торгово-развлекательный комплекс с гостиницей, кафе, административными помещениями, многоуровневыми автостоянками согласно проекту застройки №№ 34,35,36,37 по генплану | 4 435 109 680 | 399 159 870 | 74 125 843 | снос зданий и сооружений, подпадающих под пятно застройки | 28 476 308 000 |
| 9 | ул. Короля – ул. Проектируемая (согласно ПДП квартал 2) | 1,64 | Многофункциональный комплекс общественного назначения, (административный, торгово-развлекательный и др.) квартал 2 | 1 613 095 800 | 145 178 620 | 11 872 364 | снос административных зданий, здания складского корпуса и помещения гражданской обороны по ул. Короля, 71, 73, здания РП по ул. Короля, 73а, жилых домов усадебной застройки №№ 4, 6, 19, 21, 23 по ул. Короля (ранее – пер. Обувной) | 2 976 377 000 |
| 10 | ул. Либаво-Роменская | 0,5733 | Административное здание № 7 по генплану | 440 414 541 | 39 637 310 | 6 085 838 | снос зданий и сооружений, подпадающих под пятно застройки | 1 300 500 000 |
| 11 | ул. Семашко – пр. Дзержинского | 2,8158 | Многофункциональный административный, торгово-развлекательный комплекс №№ 48, 49 по генплану | 2 104 367 747 | 189 393 100 | 22 081 403 | снос индивидуальных домовладений | 6 435 027 900 |

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **27 ноября 2009 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток** в указанном выше (в таблице) размере, который составляет 9 % от начальной цены заявленного лота (лота с наибольшей стоимостью – в случае участия в торгах по нескольким лотам), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома (задатки по лотам вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

**представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере (без НДС);

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, которому по результатам аукциона в установленном порядке предоставляется земельный участок, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

дополнительно представляется:

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** для участия в аукционе начинается с **10.00 26 октября 2009 года** и заканчивается в **17.00 23 ноября 2009 года.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому выставленному лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

**Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются как единственным, подавшим заявление на участие в аукционе) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:**

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона (в установленных законодательством случаях – с его участником) договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) и договор аренды сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком может предоставить победителю аукциона рассрочку по внесению платы за предмет аукциона в установленном порядке.

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен, в установленном порядке обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого, по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам, а также приобретения лотовой документации.

В дни и время, указанные в объявлении, размещаемом на информационном стенде (фойе офиса УП «Минский городской центр недвижимости»: г. Минск, ул. К. Маркса, 39), организатором торгов предоставляется транспорт для обеспечения осмотра земельных участков желающими принять участие в аукционе.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. №№ 4, 6.

**Контактные телефоны: + 375 (17) 226 16 72, + 375 (17) 227 40 22.**

**Дополнительная информация** о выставленных на аукцион участках, а также условия участия в торгах и бланки требуемых документов размещены на официальном сайте организатора торгов **www.mgcn.by.**

## АРГАНІЗАВАЎ ВЫМАНЬВАННЕ $300 000?..

**Заснавальнік аднаго з гомельскіх прадпрыемстваў падазраецца ў тым, што арганізаваў выманьванне крэдыту ў суме 300 тысяч долараў ЗША.**

Паводле звестак, якія карэспандэнту нашай газеты паведамілі ў Камітэце Дзяржкантролю, у верасні—лістападзе мінулага года гэты заснавальнік, каб станоўча вырашыць пытанне з атрыманнем крэдыту, даў у заклад банку ізаляванае памяшканне. Праўда, пры гэтым ён наўмысна «забыўся» аб адной важнай акалічнасці: не паведаміў банку аб наяўных абмежаваннях на права распараджэння гэтым памяшканнем. Апошні ж момант, дарэчы, з'яўляецца істотнай умовай для вырашэння пытання аб прыпыненні крэдытавання. Упраўленнем Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Гомельскай вобласці ў дачыненні да падазронага заведзена крымінальная справа. Што ж датычыцца крэдыту, дык ён не пагашаны.

**Ігар ГРЫШЫН.**

ISSN 1990 - 763X

# Абарона людзей ад злачынных замахаў з'яўляецца адной з асноўных мэтаў унутранай палітыкі Беларусі

**Аб гэтым заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на ўрачыстым сходзе, прысвечаным 15-годдзю ўтварэння Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

«Асноўныя мэты ўнутранай палітыкі нашай дзяржавы — абарона людзей ад злачынных замахаў, падтрыманне грамадскага спакою і парадку, гарантыя бесперашкоднай дзейнасці ўладаў. Менавіта таму ў Службы ёсць прыярытэтныя напрамкі, але няма другарадных участкаў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у цяперашніх умовах новыя пагрозы і выклікі нацыянальнай бяспецы дыктуюць неабходнасць нешаблонных падыходаў і ў той жа час сістэмнасці ва ўмацаванні сацыяльна-палітычнай стабільнасці ў дзяржаве. Нельга недаацэньваць і знешнепалітычныя фактары, якія самым негатыўным чынам могуць паўплываць на абстаноўку ў Беларусі. Цяпер гэта ў першую чаргу наступствы сусветнага эканамічнага крызісу, які пачаўся ў ЗША і іншых буйных краінах. «Сёй-той і ў нас, і за мяжой спрабуе ў сваіх заганных мэтах выкарыстоўваць цяжкасці, што ўзнікаюць, выклікаць недавер людзей да дзеючай улады, пасеяць разлад і смуту ў грамадстве», — сказаў Прэзідэнт. Таму, падкрэсліў ён, жорсткае спыненне крыміналу, эфектыўны і правамерны адпор экстрэмісцкім дзеянням, што пагражаюць спакою і дабрабыту грамадзян, павінны быць у арсенале метадаў работы адпаведных дзяржаўных органаў.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што са знешніх пагроз самая сур'ёзная — распаўсюджванне міжнароднага тэрарызму. «На жаль, Беларусь не стала выключэннем у гэтым плане. Да гэтага часу не знойдзены арганізатары і выканаўцы страшнага злачынства супраць беларускага народа, учыненага 3 ліпеня мінулага года», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Службе бяспекі сумесна з іншымі дзяржаўнымі органамі неабходна ўдзяляць асаблівую ўвагу арганізацыі і ажыццяўленню комплексу мераў па забеспячэнні бяспекі жыхароў Беларусі пры правядзенні масавых культурных і спартыўных мерапрыемстваў. «Аднак пры арганізацыі такіх мерапрыемстваў ні ў якім разе не павінны цярпець простыя людзі, не павінны ўшчамляцца іх правы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік беларускай дзяржавы ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды супрацоўнікам Службы бяспекі Прэзідэнта Беларусі, якія найбольш вызначыліся. Цырымонія прайшла з нагоды 15-годдзя ўтварэння гэтай структуры. Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем канстатаваў, што Служба бяспекі адбылася як усебакова забяспечаная, добра падрыхтаваная і дзеяздольная дзяржаўная структура, асабовы склад якой якасна вырашае пастаўленыя перад ёю задачы.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што першачарговую ўвагу неабходна ўдзяляць распрацоўцы і актыўнаму ўкараненню новых формаў і метадаў выяўлення і спынення пагроз бяспецы ахоўных асобаў і аб'ектаў. Намаганні супрацоўнікаў усіх падраздзяленняў Службы бяспекі, адзначыў Прэзідэнт, павінны быць накіраваны на тое, каб у прынцыпе не дапусціць якіх-небудзь замахаў на ахоўных асобаў. «Поспех будзе забяспечаны толькі ў тым выпадку, калі супрацоўнікі здолеюць своечасова выявіць прыкметы магчымага злачынства, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта абавязвае вас дасканала валодаць рэальнай абстаноўкай ацэньваць наступствы, яе змяненні і выпрацоўваць эфектыўныя меры».

Прэзідэнт звярнуў увагу на неабходнасць павышэння якасці аператыўнай і інфармацыйна-аналітычнай работы, аператыўна-тэхнічнае забеспячэнне мерапрыемстваў з удзелам кіраўніка дзяржавы і іншых ахоўных асобаў, на ўдасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы Службы бяспекі, нарошчванне інжынерна-тэхнічных магчымасцяў з задзейнічаннем самых сучасных дасягненняў навукі і тэхнікі ў інтарэсах выканання службова-баявых задач. Кіраўнік дзяржавы таксама лічыць, што на прынцыпова новы ўзровень трэба ўзняць узаемадзеянне Службы бяспекі з дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі пры падрыхтоўцы і правядзенні масавых культурных і спартыўных мерапрыемстваў.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў высокі ўзровень майстэрства і прафесіяналізму ваеннаслужачых, якія яны дэманструюць на розных міжнародных і рэспубліканскіх спаборніцтвах, напрыклад, турнірах целаахоўнікаў. Паводле агульнага меркавання, беларускія супрацоўнікі прызнаны лепшымі на постсавецкай прасторы.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## БЕЛАРУСЬ АТРЫМАЕ $699,5 МЛН

**Выканаўчы савет Міжнароднага валютнага фонду завяршыў другі агляд выканання нашай краінай эканамічнай праграмы, якая падтрымліваецца рэсурсамі дамоўленасці аб крэдыце «стэнд-бай», і ўхваліў яе. Такім чынам, гэтае рашэнне дазваляе выдзеліць Беларусі чарговы крэдытны транш аб'ёмам 699,5 мільёна долараў ЗША.**

Паводле звестак дэпартамента знешніх сувязяў МВФ, у выніку агульная сума прадстаўленых сродкаў па праграме, уключаючы цяперашні транш, складзе 2,23 мільярда долараў ЗША. Як зазначыў намеснік Дырэктара-распарадчыка МВФ Такатошы Като, Беларусь дасягнула добрых вынікаў у адаптацыі сваёй палітыкі да ўмоў глабальнага крызісу. «Нягледзячы на значнае зніжэнне экспарту, скарачэнне эканомікі было невялікім у параўнанні з іншымі краінамі, якія пацярпелі ад крызісу, — падкрэсліў ён. — Карэкціроўка абменнага курсу дапамагла зменшыць знешнюю ўразлівасць, наяўны валютны рэжым забяспечвае абарону ад знешніх шокаў».

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ЗАЎТРА ЗАВЯРШАЕЦЦА ПЕРАПІС НАСЕЛЬНІЦТВА

**Калі вы яшчэ не ўзялі ўдзел у перапісе, патэлефануйце, калі ласка, па тэлефонах гарачай лініі, і перапісчыка накіруюць да вас у зручны для вас час.**

Прайсці перапіс насельніцтва можна таксама, наведаўшы стацыянарны перапісны ўчастак. Адрасы стацыянарных перапісных участкаў размешчаны на сайце Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь http://www.belstat.gov.by, а таксама пра іх можна даведацца па тэлефонах гарачых ліній. Перапіс насельніцтва неабходны, перш за ўсё, кожнаму з нас, каб нашы інтарэсы ўлічваліся, калі будуць вырашацца пытанні развіцця гарадоў і вёсак нашай краіны, будаўніцтва ў іх жылля, школ, дзіцячых дашкольных устаноў, паліклінік і бальніц, забеспячэння грамадскім транспартам. Удзел у перапісе — гэта тое нямногае, што мы можам зрабіць сёння, каб заўтра наша жыццё стала лепшым.

**Тэлефоны гарачых ліній: 8 801 100 30 30 (званкі са стацыянарных тэлефонаў бясплатныя), а таксама ў гарадах: г. Брэст 8 0162 20 53 90, 8 0162 20 31 88, г. Віцебск 8 0212 37 64 37, г. Гомель 8 0232 74 57 25, г. Гродна 8 0152 41 76 74, г. Мінск 8 017 294 55 45, 8 017 290 93 73, г. Магілёў 8 0222 22 49 19.**

# ПЕРАХОД НА 11-ГАДОВЫ ТЭРМІН НАВУЧАННЯ Ў БЕЛАРУСІ ПРАЙШОЎ АПЕРАТЫЎНА І ЛЁГКА

**Пераход агульнаадукацыйных устаноў на 11-гадовы тэрмін атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў Беларусі прайшоў аператыўна і лёгка. Аб гэтым заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Макей 21 кастрычніка на пасяджэнні калегіі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, на якім разглядалася пытанне аб эфектыўнасці мераў, што прымаюцца органамі дзяржкіравання па выкананні патрабаванняў дэкрэта № 15 «Аб асобных пытаннях агульнай сярэдняй адукацыі».**

Прадметам абмеркавання сталі не столькі дасягнутыя поспехі, колькі слабыя месцы сучаснай школы. На думку Уладзіміра Макея, максімальна поўную і аб'ектыўную карціну даў маніторынг, праведзены ў 196 установах адукацыі. Ён уключаў анкетаванне 40 тыс. рэспандэнтаў, у першую чаргу навучэнцаў, педагогаў, бацькоў. Галоўны вывад — пераход на 11-гадовы тэрмін навучання адыграў станоўчую ролю і атрымаў падтрымку насельніцтва. Аднак ёсць і памылкі, і пралікі, і праблемы — менавіта на іх быў зроблены акцэнт у выступленнях удзельнікаў адкрытай размовы на калегіі аб сённяшнім і заўтрашнім дні агульнай сярэдняй адукацыі ў краіне.

Трэць рэспандэнтаў лічыць галоўнай праблемай школьнага жыцця вялікую вучэбную нагрузку. Настаўнікі выказалі сур'ёзныя прэтэнзіі да зместу новых вучэбных планаў і праграм. І гэта справядліва: некаторыя падручнікі, у тым ліку выдадзеныя ў 2008—2009 гадах, складаныя і перанасычаныя другараднай інфармацыяй. «Не трэба шкадаваць сродкаў на заахвочванне аўтарскіх калектываў, бо ад якасці падручнікаў непасрэдна залежыць якасць адукацыі, а гэта — будучае нашай дзяржавы», — адзначыў Уладзімір Макей.

Як паказаў маніторынг, у грамадстве неаднназначна ставяцца да адмены профільнага навучання. Факультатыўныя заняткі не сталі яму дастойнай альтэрнатывай: методыка іх арганізацыі не дае магчымасці ў поўнай меры задаволіць патрэбнасці школьнікаў у паглыбленым вывучэнні асобных прадметаў. Трэба разабрацца і з практыкай правядзення заняткаў на платнай аснове. Цяжкасці ўзнікаюць і з наведваннем НВК, а гэта звужае магчымасці прафпадрыхтоўкі навучэнцаў.

Прагучала крытыка ў адрас урокаў фізкультуры. «Заняткі праходзяць нудна, забіваюць у дзецях цікавасць да спорту, а абавязковыя для выканання нарматывы часта непасільныя для вучняў», — сказаў Уладзімір Макей. Неабходна палепшыць і якасць выкладання замежных моў.

Бацькі і вучні адзначаюць, што субота не стала паўнацэнным днём адпачынку — значыць, патрабуюцца новыя падыходы да правядзення шостага школьнага дня з улікам іх інтарэсаў. «Неабходна адысці ад фармалізму і заарганізаванасці, узмацніць выхаваўчае ўздзеянне настаўнікаў на навучэнцаў пры правядзенні пазаўрочных і пазашкольных мерапрыемстваў, бо ў сістэме выхаваўчай працы няма дробязяў», — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. І падзяліўся асабістымі ўражаннямі ад наведвання адной навучальнай установы 1 верасня. «Не працавала, як трэба, апаратура, а само мерапрыемства было вельмі зацягнута, — сказаў ён. — Які эфект? Нулявы!»

Школы (асабліва ў вёсцы) маюць дэфіцыт матэматыкаў, фізікаў, хімікаў, а гарадскія школы маюць залішнюю колькасць настаўнікаў беларускай і англійскай моў, музыкі, выяўленчага мастацтва, культуралогіі. Забяспечанасць педагагічнымі кадрамі — асноўны фактар. Трэба адзначыць, што (насуперак негатыўным прагнозам апанентаў пераходу на 11-гадовы тэрмін навучання) масавых скарачэнняў настаўнікаў не было: скарачэнне засталося на ўзроўні мінулых гадоў, калі ў сувязі з дэмаграфічнай сітуацыяй і аптымізацыяй сеткі ўстаноў адукацыі пакідалі рабочыя месцы 200—300 настаўнікаў. «Неабходна пастаянна трымаць руку на пульсе, каб ніхто з настаўнікаў, якія апынуліся пад пагрозай скарачэння, не пацярпеў, не быў пакінуты на волю лёсу», — паставіў задачу кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Што датычыцца кваліфікацыі педагогаў, то яна павысілася: у 2009 годзе 89,8 працэнта педагагічных работнікаў мелі вышэйшую адукацыю (у 2008 годзе — 86,9 працэнта), вышэйшую і сярэднюю катэгорыю — 71,7 працэнта педагогаў супраць 67,9 працэнта.

Паводле слоў міністра адукацыі Аляксандра Радзькова, галоўная задача — гэта павышэнне якасці агульнай сярэдняй адукацыі, стварэнне роўных умоў для развіцця кожнага дзіцяці. На яго думку, пераход на адзінаццацігадовы тэрмін навучання не прывёў, як прадказвалі скептыкі, да зніжэння якасці навучання. Аб гэтым сведчаць і вынікі цэнтралізаванага тэсціравання, і колькасць медалістаў (залатымі і сярэбранымі медалямі ўзнагароджаны ў 2009 годзе 3,5 працэнта выпускнікоў, у 2008 годзе — 2,1 працэнта), і аналіз вынікаў абітурыенцкай кампаніі. Што датычыцца вучэбнай нагрузкі, то «патрэбны час, каб стварыць сетку, дамагчыся яе збалансаванасці з дапамогай вучоных і практыкаў», сказаў міністр адукацыі.

Кіраўнік ведамства прызнаў абгрунтаванасць прэтэнзій да якасці падручнікаў і забяспечанасці імі. Аляксандр Радзькоў праінфармаваў, што ў гэтым годзе выдадзена 137 назваў навучальных дапаможнікаў, запланавана выданне 168 назваў падручнікаў і навучальных дапаможнікаў. Паводле слоў міністра, у Беларусі ёсць плеяда таленавітых аўтараў падручнікаў, якія могуць вырашыць пастаўленыя перад імі задачы.

Асаблівая ўвага была ўдзелена на калегіі адпаведнасці заданняў цэнтралізаванага тэсціравання праграмам агульнаадукацыйных устаноў, а таксама паляпшэнню матэрыяльна-тэхнічнай базы школ. На думку Аляксандра Радзькова, неабходна павялічыць аб'ём фінансавання на капітальны рамонт. «Калі сельскія школы мы падцягнулі дзякуючы рэалізацыі дзяржпраграмы адраджэння вёскі, а школы ў буйных гарадах трымаюцца пры дапамозе моцных мясцовых бюджэтаў, то са школамі ў малых гарадах рэспублікі відавочныя праблемы», — прызнаў ён.

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Анатоль Рубінаў выказаў упэўненасць у тым, што настаўніцкі корпус адобрыў і прыняў пераход да адзінаццацігадовага тэрміну навучання, а дзякуючы мабілізацыі намаганняў педагагічных калектываў узровень адукацыі павысіўся ў гэты вельмі складаны для ўсіх пераходны перыяд. «Рашэнне было прынята правільнае і своечасовае, — лічыць Анатоль Рубінаў. — Але многія пытанні трэба дапрацаваць».

Пераходны перыяд з 12-гадовага на 11-гадовае навучанне завершыцца з выпускам штрыхкласаў. Дарэчы, у 2010 годзе ў Беларусі чакаецца каля 100 тыс. выпускнікоў школ і гімназій, у наступныя гады іх будзе каля 90 тыс.

**БЕЛТА.**

## Прэзідэнт Беларусі павіншаваў калектыў музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з 65-годдзем

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з 65-годдзем з дня заснавання музея.**

«Адкрыты літаральна праз тры месяцы пасля вызвалення сталіцы Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, музей адразу пачаў выконваць сваю ганаровую місію прапагандыста народнага подзвігу, школы патрыятычнага выхавання і фарміравання высокіх маральных якасцяў грамадзян нашай краіны», — гаворыцца ў віншаванні.

На працягу дзесяцігоддзяў некалькі пакаленняў работнікаў музея збіраюць унікальныя калекцыі, праводзяць актыўную навуковую і асветную дзейнасць, ажыццяўляюць важныя міжнародныя праекты. «Упэўнены, што ваш калектыў і ў далейшым будзе працаваць гэтак жа плённа і самаадданна, захоўваючы гістарычную спадчыну Радзімы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Абзац

◢ **Супрацоўнікі падраздзялення МНС Гомеля 21 кастрычніка позна ўвечары вынеслі з ахопленай агнём кватэры трох пацярпелых, двух удалося вярнуць да жыцця. Прыбыўшы на месца выкліку, выратавальнікі знайшлі ў задымленым пакоі трох мужчын у непрытомным стане. Два з іх былі шпіталізаваныя ў бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі, яшчэ аднаму дапамагчы не ўдалося — ён памёр ад атручэння чадам.**

◢ Студэнты-аграрыі падпалілі электрычку «Пухавічы-Мінск». Супрацоўнікі транспартнай міліцыі затрымалі трох студэнтаў па падазрэнні ў падпале вагона электрычкі, што адбыўся ў пачатку кастрычніка. Крымінальная справа распачатая супраць навучэнцаў сельгаскаледжа ў Мар'інай Горцы, аграгэхнічнага каледжа ў Смалявічах і студэнта аграрна-тэхнічнага дзяржуніверсітэта.

◢ **Выхавальнік Аршанскага каледжа вырашыў канфлікт з п'яным навучэнцам панажоўшчынай. НЗ адбылося ўвечары ў інтэрнаце. Двое маладых людзей у стане алкагольнага ап'янення захацелі наведаць сяброўак. 25-гадовы выхавальнік, які знаходзіўся на дзяжурстве, устаў на іх шляху. Тады юнакі вырашылі прарвацца ў інтэрнат і пабеглі. Дзяжурны пабег следам, захапіўшы нож. Вострая барацьба разгарнулася непадалёк ад пакоя, куды імкнуліся кавалеры. 19-гадовы навучэнец зламаў выхавальніку нос, а той параніў яго нажом. У выніку абодва апынуліся ў бальніцы. Супраць педагога распачатая крымінальная справа за прычыненне цяжкіх цялесных пашкоджанняў.**

## Поўны абзац

◢ Газета Westword, што выходзіць у амерыканскім горадзе Дэнвер, адкрыла вакансію дэгустатара марыхуаны. Газета шукае чалавека, які гатовы апісваць адчуванні пасля прыёму гэтага зелля. Абавязковым патрабаваннем для сушукальнікаў з'яўляецца наяўнасць медыцынскай даведкі, якая дазваляе купляць марыхуану ў адным са спецдыспансэраў. Такую даведку могуць атрымаць хворыя на СНІД ці рак. Дакладны памер зарплаты дэгустатара не называецца, вядома толькі, што яна будзе не вельмі высокай. Паступіла ўжо больш за 120 заяў ад тых, хто жадае заняць новую пасаду.

◢ **5-гадовы хлопчык у амерыканскім штаце Ілінойс прыйшоў у школу ў прыступе самнамбулізму. Ён быў знойдзены выпадковым мінаком на парозе пачатковай школы а палове другой ночы. Дзіця расказала, што прыйшло да сваёй маці, якая знаходзіцца ўнутры школы і глядзіць кіно. Паліцэйскія, што прыбылі па выкліку, даставілі хлопчыка ў мясцовую бальніцу, дзе была вызначана яго асоба. Высветлілася, што хлопчык жыў за два кварталы ад школы і ніколі раней не хадзіў у сне. Па словах ягонай маці, напярэдадні яна расказала дзіцяці пра кінасеансы, якія праводзяцца ў школе.**

◢ Хітры прадавец у ЗША прысабечыў латарэйны білет з выйгрышам у $1 млн. Кліент невялікай крамы папрасіў 25-гадовага прадаўца, выхадца з Няпала Панкаша Джошы, праверыць, ці выйграў яго білет. Пераканаўшыся, што камбінацыя лічбаў на білеце дае выйгрыш у 1 млн долараў, прадавец неадкладна пакінуў сваё працоўнае месца, атрымаў у офісе латарэі выйгрыш са зніжкай, які выдаецца тэрмінова ў абмен на адмову ад усёй сумы — 750 тыс. долараў — і знік. Следчыя лічаць, што ён уцёк у свой Непал. Калі яго зловяць, Джошы пагражае турэмнае заключэнне на тэрмін да 20 гадоў.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## ЦІ ЧАКАЦЬ НОВЫХ «РЭКОРДАЎ» — 2 ДОЛАРЫ ЗА 1 ЕЎРА?

Грошы




Фота Пятра ФАМІНА.

**Нібыта магнітам некалькі апошніх тыдняў цягнула амерыканскую валюту на сусветным рынку да мяжы 1,5 долара за еўра. Нягледзячы на некаторыя аптымістычныя для «амерыканца» прагнозы, што такое можа адбыцца не раней за лістапад—снежань гэтага года, кошт еўрапейскай валюты перавысіў адзнаку 1,5 долара ўжо ў сераду.**

Гэта — не канец свету, вядома ж, аднак узровень суадносін дзвюх валют, які не толькі палохае еўрапейскіх эканамістаў, палітыкаў і вытворцаў, але і б'е па «кішэнях» простых трымальнікаў зберажэнняў у доларах. Ужо не кажучы пра псіхалагічны момант, калі людзі з-за аслаблення долара гатовыя канчаткова страціць да яго давер: усё ж такі больш за год курс не «перапаўзаў» такі рубеж. Праўда, сцвярджае большасць аналітыкаў, верагоднасць таго, што сёлета будзе пераадолены калісьці рэкордны рубеж у 1,6 долара за еўра, малая. Гэтага не дапусцяць іншыя краіны, якіх такая слабасць амерыканскай валюты, мякка кажучы, не задавальняе. А вось магчымасці падзення курса долара да еўра да 1,55 долара ў найбліжэйшыя паўгода эксперты не выключаюць.

З пункту ж гледжання беларускіх экспертаў, у прыватнасці, **эксперта «Звязды», дэкана эканамічнага факультэта БДУ, прафесара Міхаіла КАВАЛЁВА,** псіхалагічны бар'ер у 1,5 долара за еўра пераадолены нават раней, чым меркавалася. І прычын таму некалькі.

— Па-першае, — кажа Міхаіл Кавалёў, — ЗША па-ранейшаму нічога не робяць са сваім унутраным і знешнім доўгам. А наадварот, гасяць пажар крызісу друкаваннем у неабмежаванай колькасці долараў. Натуральна, што гэта разумеюць кіраўнікі банкаў і разумеюць, што пасля крызісу гэта прывядзе да найвышэйшай інфляцыі на фондавых рынках, рынках сыравіны і рынку золата. Гэта значыць, долар будзе падаць у цане.

Па-другое, падобна, што такім чынам урад Злучаных Штатаў хоча паменшыць свой знешні доўг. Мы ўжо неаднаразова казалі, што ўрады многіх краін — Кітая, Японіі і іншых — накапілі вялізную колькасць долараў, і ЗША рана ці позна давядзецца гасіць гэты доўг. Таму лепш яго абясцэніць. У такой сітуацыі інтарэсы тых, хто накапіў шмат долараў, якраз заключаюцца ў наступным: каб курс амерыканскай валюты не падаў так імкліва. Але, на жаль, не атрымліваецца яго ўтрымаць.

І, нарэшце, эканамісты даўно казалі пра тое, што долар трымаўся толькі на неабгрунтаванай веры ў яго, у магутнасць амерыканскай эканомікі, на веры ў магутнасць ЗША як дзяржавы. Цяпер гэтая вера падарваная, на ўсіх сусветных перакрыжаваннях размова ўжо ідзе не аб аднапалярным свеце, а пра шматпалярны, пра рэгіянальныя валюты. І пачынаюць рабіцца захады па пашырэнні зон рэгіянальных валют — напрыклад, кітайскага юаня, спрабуюць увесці арабскі залаты дынар. Гэта, безумоўна, падрывае веру ў долар і выклікае паніку на валютных біржах. Таму, на мой погляд, тое, што долар утрымліваецца на сённяшніх рубяжах — высокае дасягненне.

**— Міхаіл Міхайлавіч, фінансавыя босы еўразоны не ў захапленні ад цяперашніх падзей і выступаюць за моцны долар.**

— Кіраўніцтва еўрапейскага Цэнтрабанка, японскі ўрад, кітайцы — усе хацелі б падтрымаць і ўтрымаць долар. Таму што інакш, па-першае, абясцэньваюцца тыя долары, якія яны назапасілі, а, па-другое, тавары гэтых краін становяцца неканкурэнтнымі на рынках ЗША. А вось тавары амерыканцаў, наадварот, — больш канкурэнтаздольнымі. Тут пытанне канкурэнцыі. Сапраўды, дэвальвацыя для такой вялікай краіны, як ЗША дазваляе павысіць яе канкурэнтаздольнасць.

**— Гэта значыць, каб пазбегнуць катастрафічных наступстваў, зацікаўленыя краіны будуць рабіць неабходныя захады, утрымліваючы долар. І ёсць надзеі на тое, што іх намаганні не стануць марнымі.**

— Мяркую, што ўзровень у 1,5 долара за еўра ўсіх задавальняе. І будзем спадзявацца на тое, што гэты рубеж стане ўстойлівым, каля яго будзе хістацца долар, што далейшага падзення яго курса не адбудзецца. Таму што беларусы трымаюць каля паловы сваіх зберажэнняў у доларах, ды і Нацыянальны банк амаль палову золатавалютных рэзерваў трымае ў гэтай валюце. Хаця асобныя замежныя банкаўскія аналітыкі прадказваюць, што не пройдзе і года, як давядзецца даваць 2 долары за 1 еўра.

**— Мне падаецца, гэта занадта песімістычны сцэнарый. Як мяркуеце, магчыма, ёсць рацыя пры ўкладанні свабодных грошай людзям ужо не арыентавацца на долар, хоць наўрад ці ён сказаў сваё апошняе слова?**

— Трэба паглядзець, ці затрымаецца долар на мяжы ў 1,5 долара за еўра. Аднак заўважу, што мы часцей ездзім у еўрапейскія краіны, дзе карыстацца трэба еўра. А таму пацыху можна павялічваць долю еўра ў зберажэннях. Да таго ж, наколькі я ведаю, Нацыянальны банк на наступны год плануе толькі ўмераную дэвальвацыю беларускага рубля. Таму тое, што захоўваецца ў беларускіх рублях, відаць, на мяжы гэтага новага года можна будзе пакінуць без змен.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## У беларусаў у 2010 годзе могуць узнікнуць праблемы з уездам у Расію на аўтамабілі

**Паводле экспертных ацэнак, страты беларускага бюджэту на аўтамабільных пошлінах пасля фарміравання Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана могуць скласці $200 млн. Аб гэтым паведаміў старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Аляксандр Шпілеўскі.**

«Беларусь не вырабляе аўтамабіляў, таму нам ёсць аб чым патаргавацца ў рамках Мытнага саюза, каб кампенсаваць страты бюджэту», — адзначыў ён.

Аляксандр Шпілеўскі пацвердзіў раней агучаную інфармацыю аб тым, што пошліны на ўвоз аўтамабіляў для фізічных асобаў не агаворваюцца ва ўжо ўзгодненым Адзіным мытным тарыфе Мытнага саюза: яны будуць рэгулявацца іншымі дакументамі. У той жа час, адказваючы на пытанне аб тым, ці будуць у сувязі з фарміраваннем Мытнага саюза пошліны на ўвоз аўтамабіляў у Беларусь для юрыдычных асобаў узняты да ўзроўню расійскіх, старшыня ДМК адказаў: «Мусіць, так».

Паводле прагнозаў экспертаў, пасля павелічэння пошлін увоз аўтамабіляў у Беларусь з-за межаў Мытнага саюза можа спыніцца практычна поўнасцю на тэрмін ад года і больш. Менавіта з гэтым і звязваюцца магчымыя страты беларускага бюджэту.

У грамадзян Беларусі з лютага па ліпень будучага года могуць узнікнуць сур'ёзныя праблемы з уездам у Расію на аўтамабілі. Такія апасенні выказаў старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Аляксандр Шпілеўскі.

Праблема звязана з тым, што ў лютым 2010 года ў Расіі ўступаюць у сілу новыя правілы афармлення часовага ўвозу аўтамабіляў на тэрмін да 6 месяцаў. Новаўвядзенне істотна ўскладніць для беларусаў уезд на расійскую тэрыторыю на аўтамабілях.

«Мы лічым гэта рашэнне расійскага боку памылковым, — сказаў Аляксандр Шпілеўскі. — Дзяржаўны мытны камітэт Беларусі ўжо накіраваў у Федэральную мытную службу Расіі адпаведны зварот, вядзецца актыўнае абмеркаванне гэтай сітуацыі».

Беларускаму і расійскаму бакам неабходна знайсці кампраміс на перыяд, які не перавышае 5 месяцаў, таму што з 1 ліпеня 2010 года праблема будзе знята аўтаматычна ў сувязі з пачаткам дзеяння дамоўленасцяў у рамках Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана.

**БЕЛТА.**

## АПОШНІ ЗАПЛЫЎ

**У Мінску на дне басейна фізкультурна-аздараўляльнага комплексу «Серабранка» ў дзве гадзіны дня ў сераду было знойдзена цела мужчыны.**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» старшы памочнік пракурора горада Мінска Сяргей Балышаў, мужчына, якому на выгляд каля 60 гадоў, прыйшоў паплаваць у басейн днём. Інструктар перыядычна назіраў за ім, а пасля знайшоў на дне. Прычым непасрэдных сведкаў, як здарылася няшчасце, няма, ды і пацярпелы на дапамогу не клікаў. Цялесных пашкоджанняў на целе мужчыны таксама не знойдзена. Паводле папярэдніх звестак, прычынай смерці стала ўтапленне. У ахвяры знойдзены і прыкметы ішэмічнай хваробы сэрца. Расследаванне па гэтым факце праводзіць пракуратура Ленінскага раёна сталіцы.

**Ігар ГРЫШЫН.**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.10.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ■ 1 долар ЗША | 2 718,00 |
| ▲ 1 еўра | 4 069,93 |
| 1 латвійскі лат | 5 742,66 |
| 1 літоўскі літ | 1 178,56 |
| 1 чэшская крона | 156,63 |
| 1 польскі злоты | 972,64 |
| ▲ 1 расійскі рубель | 93,45 |
| 1 украінская грыўня | 330,26 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 29,0858 |
| UAH | 35,3412 |
| 1000 BYR | 10,6972 |
| EUR | 43,5705 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ГРЭЦЫІ ЗАПАЛЕНЫ АГОНЬ АЛІМПІЯДЫ-2010



У грэчаскім горадзе Алімпія запалены агонь зімовай Алімпіяды 2010 года. У адпаведнасці з традыцыяй агонь быў запалены з дапамогай сонечных промняў. Ён будзе гарэць да канца Алімпіяды, якая пройдзе з 12 па 28 лютага 2010 года ў канадскім Ванкуверы. У найбліжэйшыя некалькі месяцаў адбудзецца эстафета алімпійскага агню. Яна пачнецца ў Грэцыі, а праз восем дзён паходня будзе перададзена арганізатарам Алімпіяды ў Ванкуверы.

### ГОХРАН РФ ПРАДАСЦЬ ЗА МЯЖУ БУЙНУЮ ПАРТЫЮ ЗОЛАТА ЎПЕРШЫНЮ З ЧАСОЎ СССР



**Гохран Расіі ў 2009 годзе ўпершыню з часоў СССР прадасць за мяжу буйную партыю золата, паведамляецца са спасылкай на крыніцу ў фондзе. Раней Расія прадавала золата з Гохрана, аднак аб'ёмы рэалізацыі каштоўнага металу вылічаліся толькі сотнямі кілаграмаў.**

У агульнай складанасці, Гохран плануе прадаць золата на 44,4 мільярда расійскіх рублёў, пры агульным плане рэалізацыі каштоўнасцяў у 47,4 мільярда рублёў. Улічваючы кошт каштоўнага металу, Гохран можа прадаць каля 1,44 мільёна унцый, або 44,89 тоны золата.

### ЦЭНТРАБАНКІ G20 МОГУЦЬ ПЕРАШКОДЗІЦЬ РОСТУ ЕЎРА



**Цэнтральныя банкі вядучых краін свету могуць распачаць захады для аслаблення курсу еўра, калі яго рост да долара працягнецца, паведаміла агенцтва Bloomberg са спасылкай на прагноз аналітыкаў UBS.**

Па выніках сустрэчы міністраў эканомікі і фінансаў краін ЕС было вырашана абясцэніць еўра з дапамогай Кітая.

«Курс еўра ў 1,5 долара — гэта катастрофа для еўрапейскай эканомікі і прамысловасці», — заявіў напярэдадні Анры Гэно, асабісты дарадца прэзідэнта Францыі Мікаля Сарказі. Акрамя таго, еўрапейскія палітыкі занепакоеныя аднaчасовым ростам еўра да кітайскага юаня. Пекін са снежня 2008 года штучна падтрымлівае нізкі курс юаня дзеля ўласных экспарцёраў. У кітайскіх рэзервах толькі з-за гэтых мераў назапасілася больш за 68 млрд долараў за верасень.

### ПРЫДНЯСТРОЎЕ АБРАЛА СЦЯГ ПЕРАМОГІ ДЗЯРЖАЎНЫМ СІМВАЛАМ



**Вярхоўная Рада Прыднястроўя прыняла закон аб прыраўноўванні Чырвонага Сцяга Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне да дзяржаўнага сімвала рэспублікі.**

Аўтар законапраекта дэпутат Яўген Шаўчук прапанаваў такім чынам «увекавечыць перамогу, мужнасць і гераізм савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне», распавялі ў прэс-службе ўрада непрызнанай рэспублікі, дадаўшы, што законапраект быў распрацаваны па аналогіі з дзейным законам РФ. З гэтага часу Сцяг Перамогі будзе ўзнімацца на дзяржустановах Прыднястроўя ў святочныя дні.

### У БАВАРЫІ ВЫПУСЦІЛІ ЭРАТЫЧНЫ КАЛЯНДАР ДЛЯ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ СЯЛЯНСКАЙ ПРАЦЫ

**Саюз маладых фермераў Баварыі выпусціў эратычны каляндар «German Girls Edition 2010» з маладымі сельскімі працаўніцамі з Германіі і Аўстрыі, паведамляе інтэрнэт-выданне The Lockal.**

Каляндар заклікaны змяніць традыцыйныя ўяўленні аб сельскай гаспадарцы і зрабіць фермерскую працу больш прывабнай для моладзі. Як адзначаецца на сайце Саюза, каляндар прысвечаны «ўсім маладым фермеркам Нямеччыны і Аўстрыі, якія з упэўненасцю ў сабе і з задавальненнем займаюцца сельскай працай».


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
### по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договоров аренды земельных участков для обслуживания продаваемого недвижимого имущества

| | |
|---|---|
| **Лот № 1** Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке | Капитальное строение инв. № 400/С-4513, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Пучкова, 28, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 440100000001004715 площадью 0,1343 га сроком на 50 лет |
| | Начальная цена – 892 981 094 руб., сумма задатка – 89 298 000 руб. |
| | Продавец недвижимого имущества: Дочернее унитарное предприятие «Грузовой автомобильный парк № 2» республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гродноoблавтотранс» |
| **Лот № 2** Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке | Капитальные строения инв. №№: 450/С-903, 450/С-900, 450/С-901, 450/С-902, 450/С-904, 450/С-10430, 450/С-10431, 450/С-10547, 450/С-10553; зеленые насаждения 10 ед., расположенные по адресу: военный городок № 4, Гродненская обл., г. Слоним, ул. Советская, 60, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 425450100000002288 площадью 0,7102 га сроком на 50 лет |
| | Начальная цена предмета аукциона – 229 435 133 руб., сумма задатка – 22 943 000 руб. |
| | Продавец недвижимого имущества: Государственное лесохозяйственное учреждение «Ивацевичский военный лесхоз» |
| Организатор аукциона (наименование, адрес, тел.) | Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гродноoблимущество»), 230023, г. Гродно, ул.17 Сентября, 39, тел.: (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней) |

1. Аукцион состоится **5 ноября 2009 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами принимаются Организатором аукциона **по 30 октября 2009 года до 16.00**, кабинет 6.

3. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет Организатора аукциона – Фонда «Гродноoблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549.

4. Решение о предоставлении победителю аукциона (претенденту на покупку) земельного участка принимается местным исполнительным комитетом в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

5. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков.

6. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

7. **Подробная информация** – в извещениях о проведении аукциона, ранее опубликованных в газете «Звязда» **5 сентября 2009 г. № 167 (26525), 10 сентября 2009 г. № 170 (26530).**

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
## ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже единым лотом имущества детского оздоровительного лагеря «Бригантина», (балансодержатель – УП "Завод точного машиностроения «Планар-ТМ»), расположенного по адресу: Минская область, Молодечненский район, 0,5 км севернее д. Петровщина, детский оздоровительный лагерь «Бригантина». В состав лота входит следующее имущество:

| № п/п | Наименование объектов | Инв. № |
|---|---|---|
| 1. | Физкультурно-оздоровительный комплекс (общая площадь – 283,7 кв.м) | 630/С-47603 |
| 2 | Котельная с навесом (общая площадь – 396,4 кв. м) | 630/С-47604 |
| 3 | Детсад-ясли корпус №1 (общая площадь – 1276,0 кв. м) | 630/С-47605 |
| 4 | Трансформаторная подстанция (общая площадь – 18,0 кв. м.) | 630/С-47607 |
| 5 | Административно-приемный корпус (общая площадь – 101,1 кв. м) | 630/С-47608 |
| 6 | Детсад-ясли на 140 мест корпус № 2 (общая площадь – 1096,1 кв. м) | 630/С-47609 |
| 7 | Здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей (общая площадь – 732,4 кв. м) | 630/С-49350 |
| 8 | Здание специализированное для общественного питания (общая площадь – 1749,6 кв. м) | 630/С-49353 |
| 9 | Здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей (общая площадь – 735,4 кв. м) | 630/С-49354 |
| 10 | Канализационно-насосная станция (общая площадь – 23,5 кв. м.) | 630/С-47570 |
| 11 | Склад (общая площадь – 165,1 кв. м.) | |
| 12 | Бытовое здание для обслуживающего персонала (общая площадь – 131,8 кв. м) | |
| 13 | Кабельная линия | |
| 14 | Внешние кабельные сети | |
| 15 | Наружное освещение | |
| 16 | Наружные сети тепловые, водопроводные и т.п. | |
| 17 | Наружная канализация | |
| 18 | Водопровод с артскважиной | |
| 19 | Водонапорная башня | |
| 20 | Устройство подъездной автодороги | |
| 21 | Ограждение с воротами | |
| 22 | Противопожарный подъезд к водоему | |
| 23 | Котел Минск-1 | |
| 24 | Котел Минск-1 | |
| 25 | Теплообменник Р-025-8,9-1Х | |
| 26 | Лифт грузовой малый | |
| 27 | Лифт грузовой г/п 100 кг | |
| 28 | Таль электрическая МЗ-320 | |

Начальная цена – 1 824 327 605 белорусских рублей.

Земельный участок площадью 11,75 га (в том числе: земельный участок площадью 10,3544 га, кадастровый номер 623881300098000008, земельный участок площадью 0,0232 га, кадастровый номер 623881300098000007, земельный участок площадью 1,3754 га, кадастровый номер 623881300098000009) предоставлен для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений детского оздоровительного лагеря «Бригантина».

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 180 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Аукцион состоится 09 ноября 2009 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 23.10.2009 по 06.11.2009 в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017)227 48 36, 227 40 22.**

**Сёння дзявяты дзень, як пайшла з жыцця КАЗАКОВА Ларыса Паўлаўна...**

**Дзякуй усім за падтрымку, добрыя словы, памяць.**

**Сваякі.**

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

23 КАСТРЫЧНІКА 2009 г. ПЯТНІЦА № 40 (15594)

Выставы

# СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ — СУЧАСНЫМ ШКОЛАМ

ШЧЫРА кажучы, хто б мог меркаваць яшчэ 5—10 гадоў таму, што ноўтбук калісьці перастане быць прадметам раскошы, а стане жыццёва неабходнай рэччу ў вучэбным працэсе. Што настаўнікі нарэшце перастануць баяцца камп'ютараў, больш за тое, кіраўнікі і педагогі, якія ўкараняюць у навучальны працэс інфармацыйныя тэхналогіі, будуць матэрыяльна заахвочвацца. А ганаровае месца ў класах зоймуць... інтэрактыўныя дошкі. Гэтымі днямі ў сценах Мінскага дзяржаўнага палаца дзяцей і моладзі (Старавіленскі тракт, 41) праходзіць спецыялізаваная выстава «Вучэбныя тэхналогіі», мэтай якой — праінфармаваць педагагічныя кадры ўстаноў адукацыі аб навінках у сферы вучэбных тэхналогій, наглядна прадэманстраваць ім апошнія распрацоўкі ў галіне сродкаў навучання і заключыць выгадныя дамовы з пастаўшчыкамі.

Адзін са стэндаў, які цяжка не заўважыць, належыць кампаніі «Інтэрлаб Бел». Тут прадэманстравана лабараторнае і дэманстрацыйнае абсталяванне для кабінетаў фізікі, хіміі і біялогіі: камплекты па балістыцы, механіцы, прыбор для правядзення электролізу вады, для вывучэння праламлення святлу, вымярэння кандэнсату, вывучэння фотаэфекту, дзейныя мадэлі крывяноснай і дыхальнай


Дырэктар кампаніі «ІНТЭРЛАБ БЕЛ» Алена АКАПЯН дэманструе абсталяванне для кабінета хіміі.

сістэм чалавека, мадэль вока і выпраўлення дэфектаў зроку і многае іншае. Чамусьці прыгадваецца тэрмін «крэйдавая фізіка», які з'явіўся у расійскіх школах пэўны час таму з намёкам на «доследы» па фізіцы з крэйдай па дошцы. У беларускіх школах, шчыра кажучы, сітуацыя не нашмат лепшая: абсталявання або ўвогуле няма, або яно ўжо непрыдатнае для эксплуатацыі.

— Мы з'яўляемся маладой беларускай кампаніяй, якая цяпер займаецца пастаўкамі вучэбнага абсталявання кампаніі «Кармі-Інтэрлэб» з Ізраіля, — расказвае дырэктар «Інтэрлаб Бел» Алена АКАПЯН. — Але наша мэта — наладзіць выпуск гэтага абсталявання на тэрыторыі Беларусі. Тыя прыборы, што вы бачыце, гэта абсталяванне, якое ідзе ад настаўніка да настаўніка: усе прадукцыю, якую мы прапануем для беларускіх школ, распрацаваная ізраільскімі педагогамі, што, на наш погляд, вельмі важна. Але нас, зразумела, цікавіла, наколькі яны «ўпісваюца» ў вучэбны працэс у беларускіх школах. Таму мы звярнуліся ў Міністэрства адукацыі з мэтай навукова-педагагічнай экспертызы нашай прадукцыі і атрымалі станоўчыя водгукі: высветлілася, што нашы прыборы цалкам адпавядаюць Пераліку вучэбнага абсталявання, якое выкарыстоўваецца ў агульнаадукацыйных школах у Беларусі. Прызнаемся, што мы «хварэем» за кожны свой прыбор, таму кожны з іх суправаджаем метадычным дапаможнікам. Для нас вельмі важная таксама зваротная сувязь. Напрыклад, у мінулым навучальным годзе мінская гімназія № 22 закупіла ў нас абсталяванне для кабінета па фізіцы, а ў гэтым навучальным годзе — ужо і па біялогіі.

Цікавы комплекс-трэнажор для фарміравання навыкаў неадкладнай даўрачэбнай дапамогі ў надзвычайных сітуацыях дэманстравала наведвальнікам выставы расійскае навукова-вытворчае аб'яднанне «Элтэк»: комплекс уключае муляжы дарослага чалавека і дзіцяці, паўнамаштабны анатамічны дысплэй з наборам відэаімітатараў жыццёва важных унутраных органаў чалавека, аўдыёвізуальны тэст-пульт, камп'ютар з праграмным забеспячэннем, якое мадэлюе пэўныя абставіны і тэстуе паводзіны чалавека ў экстрэмальных сітуацыях. А сітуацыі прапануюцца самыя розныя: ад звычайнага дзіцячага траўматызму і электратрамваў да хімічнага пражэння і тэрарызму. Практычная работа суправаджаецца моўнымі каментарамі электроннага інструктара, а эфектыўнасць навучання ацэньваецца па прыкметах аўтаматычнага «ажыўлення» пацярпелага, якое мадэлюецца на муляжы і на экране анатамічнага дысплея.


Стэнд кампаніі «ІНТЭРЛАБ БЕЛ».

Унітарнае прадпрыемства «Учпрамтэхна»паспрабавала ўразіць наведвальнікаў выставы сучаснымі сродкамі навучання: інтэрактыўнымі дошкамі, інтэрактыўнымі сістэмамі, інтэрактыўнымі сістэмамі апытання, сэнсарнымі панэлямі, бесправаднымі планшэтамі, лічбавымі мікраскопамі, метэастанцыямі для кабінетаў геаграфіі і гэтак далей. Але ў гэтым выпадку лепш адзін раз пабачыць, чым сто разоў пачуць. Калі назіраеш за тым, як «настаўнік» кіруе з дапамогай сваёй рукі выявамі на інтэрактыўнай дошцы, гэта проста заваражвае. Цікавіцца, а ці складана засвоіць такую тэхніку?

— Гэтай тэхнікай можа кіраваць любы чалавек, які ўмее ўключаць камп'ютар і карыстаецца мінімальным наборам яго функцый, — смяецца намеснік генеральнага дырэктара «Учпрамтэхна» Лія ЖУК. — Меню тут — элементарнае, а давядка даецца на рускай мове.

Зразумела, нельга было не заўважыць і самую яркую экспазіцыю на выставе, дзе зачаравана стаялі не толькі дзеці, але і іх бацькі: магчыма таму, што такога выбару цацак не было ў нашым дзяцінстве. Беларускае вытворчае прадпрыемства «Палессе» спецыялізуецца на выпуску пластмасавых цацак з экалагічна бяспечных матэрыялаў. У яго асартыменце можна ўбачыць што заўгодна: і наборы для сюжэтна-ролевых гульняў, і канструктары самага рознага зместу, і развівальныя цацкі, разнастайныя аўтамабілі, машыны-каталкі — усяго 650 найменняў. Ну якое дзіця, скажыце, адмовіцца ад уласнай дзіцячай кухні ці ўласнай студыі, якая плаўна трансфармуецца ў крэсла і столік, дзе можна падсілкавацца і... зноў за гульню. Дарэчы, прадукцыя «Палесся» экспартуецца ў 26 еўрапейскіх краін, а таксама ў Расійскую Федэрацыю.

Застаецца дадаць, што выстава будзе працаваць па 23 кастрычніка ўключна. У яе праграме запланавана правядзенне 50 прэзентацый і майстар-класаў на тэмы «Гульня і цацка як сродак развіцця дзіцяці», «Віртуальны кабінет замежнай мовы», «Выкарыстанне электроннага вучэбнага дапаможніка ў выкладанні беларускай літаратуры», «Сучасныя музычныя методыкі і тэхналогіі развіцця слыху і голасу ў дзяцей дашкольнага ўзросту» і многія іншыя.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**


Дзецям спадабаецца прадукцыя беларускага прадпрыемства «Палессе».

Абітурыент-2010

## ПРАДПРЫМАЛЬНІЦКАЯ ХВАТКА — СА ШКОЛЬНЫХ ГАДОЎ

Дзве новыя «школы юных» для вучняў 9—11 класаў пачынаюць працаваць у Беларускім дзяржаўным універсітэце: адна з іх арыентавана на старшакласнікаў, якія мараць аб эканамічнай ці прадпрымальніцкай дзейнасці, а другая — на падлеткаў, якія збіраюцца стаць IT-спецыялістамі.

Як расказалі журналісту «Звязды» ў Белдзяржуніверсітэце, у «Школе юнага эканаміста (прадпрымальніка)» прадугледжаны практыкумы, дзелавыя і ролевыя эканамічныя гульні, псіхалагічныя трэнінгі, якія вучаць падлеткаў пачаткам прадпрымальніцкай дзейнасці. Да таго ж засваенне эканамічных ісцін праз гульнявое мадэляванне і практаванне практычных сітуацый дапамагае развіць у іх крэатыўнасць мыслення, самастойнасць у прыняцці рашэнняў, развіць камунікацыйныя здольнасці і ўменне працаваць у камандзе. Паралельна з гэтым у старшакласнікаў будзе магчымасць прайсці падрыхтоўку па прадметах, неабходных пры паступленні на эканамічныя спецыяльнасці.

А ў «Школу юнага IT-спецыяліста» запрашаюць тых з падлеткаў, хто плануе паступаць на спецыяльнасці «вэб-дызайн», «вэб-праграміраванне» і «інтэрнэт-тэхналогіі». Як і ў першым выпадку, у старшакласнікаў будзе магчымасць падрыхтавацца паралельна да цэнтралізаванага тэсціравання па прадметах, якія патрабуюцца пры паступленні на спецыяльнасці сферы высокіх тэхналогій. У абедзвюх школах для дзевяцікласнікаў і дзесяцікласнікаў прадугледжана прафарыентацыйная дыягностыка і прафесійнае кансультаванне. Пасля заканчэння поўнага курса навучання выпускнікам школы будзе выдадзены адпаведны сертыфікат. Пачатак заняткаў запланаваны на канец кастрычніка. Акрамя новых «школ юных», у Белдзяржуніверсітэце ўжо не першы год дзейнічаюць таксама школа абітурыента механіка-матэматычнага факультэта, школа абітурыента фізічнага факультэта, школа юнага географа і краязнаўца і школа юнага геолага.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Мы і свет

# «БЕЛАРУСЫ ЗДЗІЎЛЯЮЦЦА, КАЛІ ЧУЮЦЬ, ШТО МЫ ГАВОРЫМ ПА-БЕЛАРУСКУ...»

## Якой бачыцца Беларусь першым сербскім беларусістам?

**«Сербскія беларусікі» — гэта Ана, Наташа, Івана, Ураш, Сандра і Алівера. Усе яны вучацца ў Бялградзе. Калі ў 2006 годзе там праходзіла «Еўрабачанне», усёй кампаніяй яны наведалі вечарынку нашага Руслана Аляхно. Спадабалася. Пасля нават інтэрв'ю Першаму каналу давалі. «Было вельмі страшна, — прызнаецца Ана Груіч, — але неяк вытрымалі». Здаецца, нічога асаблівага — расказаць на камеру пра свае ўражанні. Але яны рабілі гэта пабеларуску! Ужо на працягу двух гадоў Ана, Наташа, Івана, Ураш, Сандра і Алівера разам з сябрамі вучаць беларускую мову, наведваючы адпаведны факультатыў у Святланы Галяк.**



— Іхнюю мэтанакіраванасць, захапленне беларускай мовай варта было б узяць за прыклад і некаторым беларусам, — кажа Святлана і з гонарам дадае. — **Гэта першая група студэнтаў у гісторыі Сербіі, якая пачала вывучаць беларускую мову.** Прычым у свой вольны час. Калі я набірала групу, вельмі хацела, каб пасля для іх была хоць нейкая ўзнагарода. І паездка ў Беларусь — гэта выдатны падарунак. У нас вельмі добрая культурная праграма, дзякуй філалагічнаму факультэту БДУ за падтрымку і дапамогу. Святлана Галяк ужо два гады выкладае ў Сербіі беларускую мову.

— Калі я паехала ў камандзіроўку ў Бялград, то прапанавала сербскім калегам дазволіць мне арганізаваць заняткі па беларускай мове, факультатыўна. Гэта быў своеасаблівы эксперымент. Калегі згадзіліся і дазволілі, але пэўны скепсіс я адчувала: «Ці набяру я групу». Самі разумееце, каб студэнты прыходзілі ў свой вольны час на дадатковыя заняткі, гэта малаверагодна. І мы падрыхтавалі абвестку: будзе набірацца такі адмысловы курс па беларускай мове, каб студэнты прыходзілі, запісваліся. Але запісалася толькі два чалавекі... Цікавасць была, проста інфармацыі пра нашу краіну ў Сербіі няшмат. Звычайна людзі пыталіся, а ці ёсць увогуле адрозненні паміж рускай і беларускай мовамі? Тады я пачынала тлумачыць, прыводзіць прыклады.

### ДАПАМАГЛА ПРЫГОЖАЯ АБВЕСТКА

— Мы былі на занятках, калі да нас прыйшла наша выкладчыца Святлана Галяк, — кажа **Ана ГРУІЧ**. — Яна вельмі цікава распавяла пра Беларусь. Намалявала на дошцы абрысы краіны і яе суседзяў. Навучыла некалькім беларускім словам, такім, як «добры дзень», «дзякуй», «калі ласка». Заняткі праходзілі факультатыўна, але нам было цікава паспрабаваць, якое гучанне ў гэтай мовы, якімі будуць новыя словы. Мы ведалі, што будзем спяваць беларускія народныя песні, што можа з'явіцца магчымасць прыехаць сюды ў Мінск. Пасля была і абвестка, вельмі прыгожа намаляваная, якая нам вельмі спадабалася!

І вось так гэта ўсё пачалося.

— Чаму я пачаў вывучаць беларускую мову? Таму што мне вельмі падабаецца творчасць Марка Шагала, — прызнаецца серб **Ураш ДЖОРДЖАВІЧ**. — А Шагал нарадзіўся тут. Таму я і зацікавіўся Беларуссю.

### «У СЕРБСКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ МОЎ ЁСЦЬ ВЕЛЬМІ ШМАТ АГУЛЬНЫХ СЛОЎ»

Калі я запытаў, якія з беларускіх слоў найбольш даспадобы сербскім студэнтам, то ў адзін голас яны адказалі — «дзякуй» і «калі ласка». Як высветлілася, беларускія словы «мама» і «тата» па-сербску гучаць аналагічна, таму здзіўленнем для сербаў не сталі.

— Я не чакала, што людзі будуць такімі ветлівымі і ўвогуле прыветлівымі. Яны любяць сербаў і здзіўляюцца, калі чуюць, што мы гаворым па-беларуску, — працягвае думку **Івана МРДЖА**. — Я ведала, што некаторая моладзь у Беларусі неахвотна размаўляе пабеларуску. Але менавіта гэта і было цікава. Пачаць вучыць гэтую мову, каб дапамагчы ў яе распаўсюджванні. Калі мы толькі прыехалі, то адразу пачалі гаварыць з людзьмі па-беларуску.

— Беларуская мова — мая другая спецыяльнасць, сам вучуся на юрыста, — кажа **Ураш ДЖОРДЖАВІЧ**. — Я ўжо трэці раз у Мінску. І мне, як сербу, здаецца, што ў сербскай і беларускай мовах няма такой вялікай розніцы, як паміж рускай і беларускай мовамі. Таму што нашы літаратурныя мовы абедзве склаліся амаль цалкам на народнай аснове, у адрозненне ад рускай. У сербскай і беларускай моў ёсць вельмі шмат агульных слоў.

### ПРА ГАРАДЫ, МУЗЫКУ І ТАНЦЫ

— У Мінску і Бялградзе амаль аднолькавая колькасць жыхароў, — кажа **Сандра ДЖУКІЧ**, якая ўжо трэці раз у нашай краіне. — Гомель мне здаўся вельмі вялікім горадам. Бо ў Сербіі нават 10 тысяч жыхароў многа, а ў Гомелі — ажно 500 тысяч, так што горад вельмі вялікі. У Сербіі мала такіх вялікіх гарадоў.

Мінулы раз мы былі тут у верасні, калі надвор'е было добрае і мы вельмі шмат чаго бачылі — але прыязджалі толькі на два тыдні, і гэтага было мала. Тады вельмі мала ведалі беларускую мову, бо толькі паспелі скончыць першы курс, але ўсё адно я расказвала ўсім, як тут прыгожа і якія цудоўныя людзі тут жывуць.

Сербка **Наташа НІКАЛІЧ**, у адрозненне ад Сандры, у беларускай сталіцы ўпершыню. І найбольш яе ўразілі самі беларусы.

— Калі я пазнаёмілася з беларускай моладдзю, мне спадабалася іх шчырасць і адкрытасць. А беларускія хлопцы запомняцца культурнымі, гасціннымі, цікавымі. А яшчэ яны вельмі добра танцуюць!

— Калі казаць пра танцы, то мне здаецца, сербскія танцы адаптаваныя больш на тое, каб танчыць усім разам — у коле, — разважае **Сандра ДЖУКІЧ**. — Беларусы ж, наколькі я паспела заўважыць, танцуюць пераважна ў парах. А ўвогуле наш фальклор агульнаславянскі, таму многія рэчы ў ім дастаткова падобныя.

**— Не так даўно ў Бялградзе праходзіў конкурс песні «Еўрабачанне». Ці сачылі вы за ім?**

Адказвае **Ураш**:

— У Сербіі конкурс «Еўрабачання» папулярны. У нас існуе адборачны тур, пераможца якога становіцца прадстаўніком нашай краіны на гэтым конкурсе. Самае цікавае, што кожны раз на нацыянальным адборы ў гледачоў зусім іншае меркаванне, чым у журы.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

МТС — аграгарадкам

# МАЛЕНЬКАЯ ШВЕЙЦАРЫЯ СЯБРУЕ З МТС

Безумоўна, у наш хуткі час высокіх тэхналогій «мабілізацыя» — неабходная рэч у развіцці любога рэгіёна. І МТС «мабілізуе» Пастаўскі раён так, каб заўсёды можна было заставацца на сувязі тым, хто выбраў сетку найбуйнейшага аператара сотавай сувязі краіны.

Неаднаразова быў у Паставах. Тут адпачываеш душой. І хоць, вядома ж, у гэтым правінцыйным гарадку не без праблем, але, гуляючы па ўтульных і ціхіх пастаўскіх вулачках, нейкім чынам пачынаеш зайздросціць тутэйшым. Прыгожыя храмы, цэлы стары архітэктурны комплекс — дамы майстроў у самым цэнтры. На жаль, вельмі мала ў рэспубліцы засталося архітэктурных пабудоў дарэвалюцыйных часоў. Паставам пашанцавала ў гэтым сэнсе. Тут ёсць на што паглядзець. На тэрыторыі края каля дваццаці помнікаў архітэктуры і культуры.

А яшчэ гэта край азёраў. Тут іх ажно 115, а таксама 16 вадасховішчаў, пад 90 рэк і ручайкоў. Аматарам воднага турызму ў гэтым сэнсе пашанцавала.

— З лёгкай рукі журналістаў у апошні час Пастаўскі край называюць маленькай Швейцарыяй, — кажа старшыня Пастаўскага райвыканкама Віктар Сяргеевіч Гутараў. — Цяпер Паставы перажываюць новую эпоху адраджэння, аднаўляюцца. Горад будуецца, добраўпарадкоўваецца і прыгажэе з кожным днём усё болей...

Аўтару гэтых радкоў пашанцавала асабіста пазнаёміцца з кіраўніком выканаўчай улады Пастаўскага края. Чалавек ён шчыры, дзелавіты. Адразу адчуваецца, што Віктар Сяргеевіч вельмі хоча, каб Пастаўскі край багацеў, каб людзям тут было ўтульна жыць. Каб ганарыліся тым, што жывуць на зямлі з багатай гісторыяй. І многае для гэтага ў Пастаўскім раёне робіцца. А колькі яшчэ запланавана!



Безумоўна, вялікія інвестыцыі ў развіццё аграрнага сектара павінны ўрэшце акупляцца. У Пастаўскім раёне — адным з самых буйных сельскагаспадарчых раёнаў Прыдзвінскага края — у гэтым пытанні ёсць канкрэтныя дасягненні. Экалагічна чыстыя прадукты харчавання адсюль карыстаюцца вельмі добрым попытам не толькі ў нашай краіне. У прыватнасці, смятану, малако і гэтак далей пад гандлёвай маркай «Паставы — гарадок» добра ведаюць у Расіі. Госці вязуць з Паставаў дамоў смачныя далікатэсы не толькі сабе, але і знаёмым.



У Пастаўскім раёне з году ў год павялічваюцца ўраджаі збожжавых і рапсу, растуць надоі малака... У рамках адпаведных праграм у ліку іншых развіваецца льнаводства. Лён — адзін з сімвалаў Беларусі. У краі ёсць ільнозавод. І, нягледзячы на цяжкасці, тут стараюцца выконваць дзяржаўны заказ па продажы льновалакна. Як адзначаюць спецыялісты, у льняной галіны добрыя перспектывы, бо натуральныя льняныя тканіны і адзенне становяцца ўсё болей запатрабаванымі.

А як добра купіць на памяць аб прабыванні ў краі нейкі сувенір з таго ж лёну! Гэта можна зрабіць у музейным комплексе — Доме рамёстваў «Стары млын». Тут, дарэчы, на свае вочы можна ўбачыць, як працуюць рамеснікі, і нават павучыцца ў іх старадаўняму майстэрству.

Дзякуючы кампаніі МТС не будзе праблем падчас падарожжа па краі падзяліцца ўражаннямі са сваякамі, сябрамі. Надзейнасць вядучага аператара мабільнай сувязі праверана часам. Улічваючы законы канкурэнтнага рынку, МТС своечасова ідзе насустрач сваім абанентам. Усё болей прывабнымі становяцца тарыфныя прапановы, усё багацейшы выбар паслуг.

У Пастаўскім краі ўжо па-добраму ацанілі ўсю карысць быць абанентам менавіта МТС. Наўрад ці іншыя сотавыя кампаніі могуць канстатаваць, што колькасць іх абанентаў у гэтым рэгіёне не толькі не памяншаецца, а стабільна павялічваецца.

Штогод у Пастаўскі раён — беларускую «маленькую Швейцарыю» — прыязджае ўсё болей турыстаў. Між іншым, а чаму б насамрэч і не называць Пастаўскі раён Швейцарыяй? І гара тут ёсць — найвышэйшы пункт раёна на вышыні ажно пад 250 метраў. На гэтым узроўні знаходзіцца «пік» гары Высокай. І прыгожа тут, спакойна, як у сапраўднай Швейцарыі.

Візітнай карткай гарадка і ўсяго Пастаўскага раёна стаў фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік». З многіх краін свету прыязджалі паўдзельнічаць у гэтым фестывалі музыканты, танцоры.

Некалькі гадоў таму тут прайшло рэспубліканскае свята «Дзень беларускага пісьменства». Мне пашчасціла асвятляць гэтую падзею рэспубліканскага маштабу. Свята атрымалася, як кажуць, на самым высокім узроўні. Напэўна, усе яго ўдзельнікі і госці надоўга запомняць непаўторную атмасферу гэтага свята, у якім сапраўды ёсць частка душы беларускага народа.

Аграгарадкі Андроны, Навасёлкі і многія іншыя — гэта сучасныя пасёлкі, у якіх ствараецца неабходная інфраструктура для таго, каб вяскоўцы былі забяспечаны ўсімі выгодамі.

Даўно ўжо прайшлі часы, калі па дробных пытаннях трэба было ехаць у райцэнтр або нават у абласны цэнтр. Цяпер у аграгарадках працуюць крамы з вельмі багатым выбарам тавараў. А чаго няма — зрабіце замову, прывязуць прама дадому, доўга не зацягваючы. Адпаведна і сфера бытавых паслуг не адстае ад патрабаванняў часу. Вясковыя школы і бібліятэкі, клубы таксама не горшыя, а часам і лепшыя, чым некаторыя гарадскія.

Падцягваюцца да гарадскога ўзроўню ўстановы аховы здароўя. А якая бальніца ў раённым цэнтры! Медыкі тут высокапрафесійныя. І «цуд» — маладыя ўрачы не «бягуць» з правінцыйнага горада адразу пасля таго, як адпрацуюць неабходны час пасля размеркавання. Усё таму, што тут, як і ў цэлым па раёне, навучыліся працаваць з маладымі кадрамі.



Нават не магу і прыгадаць, хто з маіх знаёмых, якія жывуць у маленькай «Швейцарыі», не сябруе з МТС. Ведаю і тых, хто мае некалькі нумароў МТС — па рабоце і для сябе. Улічваючы спецыяльныя прапановы кампаніі МТС для людзей пенсійнага ўзросту, усё болей нашых паважаных бабуль і дзядуляў становяцца абанентамі аператара сувязі. Ніякай абаненцкай платы, і ты заўсёды на сувязі з дзецьмі, унукамі. Выгадна беларускім пенсіянерам сябраваць менавіта з МТС.

**Аўтар рубрыкі заўсёды гатовы з вялікім задавальненнем вас выслухаць па тэлефоне (029) 5 107 555.**

**Аляксандр ПУКШАНСКІ. Пастаўскі раён. Фота аўтара.**

Асабістая думка

# З ЗЯЛЁНЫМ ПАРТФЕЛЕМ У РУКАХ,

## ці Будні перапісчыка-2009 у пытаннях без адказу?

**«Гэта абавязак кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. За прапушчаныя заняткі ніякіх рэпрэсій праводзіцца не будзе, усе выкладчыкі папярэджаныя. Ды і да сесіі вас у любым выпадку дапусцяць, нават з хвастамі». З такімі словамі адпраўлялі маладых хлопцаў і дзяўчат на фронт перапіснoй кампаніі.**

Адпраўляў, трэба сказаць, на абавязковай аснове. Спісы перапісчыкаў былі зацверджаны рэктарам, і толькі пасля даведзеныя да іх саміх. Сказаць, што гэта выклікала эмоцыі, — гэта нічога не сказаць. Студэнты, якія ўжо за некалькі гадоў паспелі адвыкнуць ад школьных метадаў, проста не маглі спакойна ўспрыняць тое, што іх вось так кідаюць на амбразуру. Заспакойлівым фактарам не стаў і кактэйль з прывабных інгрэдыентаў: звальненне ад заняткаў на месяц, «асаблівыя ўмовы» здачы сесіі, якія прыгадваліся вышэй, ды праязны білет на ўсе віды грамадскага транспарту. Здаецца, зрабіце вы ўсё тое самае, толькі крышачку ў іншай паслядоўнасці: спачатку невялічкая рэклама з усімі ўмовамі ўдзелу ў грамадзянскім абавязку, а потым пытанне «Ну, хто хоча паўдзельнічаць?» — і ахвотных не хадзіць цэлы месяц ва ўніверсітэт набралася б больш, чым патрэбна! А так большасць падзялілася эмоцыямі, зразумела, што бесперспектыўны гэта занятак, і пайшла перапісваць народ. Толькі самыя «разумныя» раптам захварэлі (чытай: не змаглі змірыцца з такой пастаноўкай пытання).

Пасля невялічкага курсу «як жа ўсё зрабіць, каб самім не заблытацца ва ўсіх гэтых паперках», які складаўся з двух заняткаў па дзве гадзіны, нас усіх чакаў «экзамен». Без двукосся і не напішаш, бо галоўная ўмова была — зрабіць як мага менш памылак у тэсце. Карыстацца пры гэтым можна было ўсім: і канспектамі, і брашурамі, і нават падказкай выкладчыка. Зразумела, вынікі ўсе паказалі добрыя. А калі дрэнныя, не ўзялі б?

Ва ўсіх рэкламных роліках галоўнай каштоўнасцю перапісчыка, акрамя яго самога, безумоўна, называецца зялёны партфель. Давайце разам зазірнем у яго. Пасведчанне і значок ёсць, бланкі на месцы, запісная кніжка, якая знешне больш нагадвае запісны альбом, на месцы, флікер тут ( куды ж без яго), ліхтарык... Так, а дзе мой ліхтарык? І свістка няма. Ва ўказаннях перапісчыку аб парадку працы пры правядзенні апытання рэспандэнтаў і запаўнення запісной кніжкі сцвярджаецца, што перапісчык атрымоўвае разам з вышэйназванымі рэчамі яшчэ ліхтарык і свісток. Насамрэч, высвятляецца, што ліхтарык толькі адзін на пяцярых. Свісткоў (вось растлумачце мне, такому несвядомаму перапісчыку, навошта наогул свісток? Чым ён дапаможа, калі ў той ці іншай кватэры цябе сапраўды негасцінна сустрэнуць?) трошкі больш — два на пяцярых. Два гады ў фізмаце не прайшлі міма мяне, так што адразу ў галаве нараджаецца наступнай задачка, узроўню дзесьці 4-5-га класа агульнаадукацыйнай школы. Умовы: у краіне каля 40 000 перапісчыкаў, дзяржавай вылучаны сродкі на начынне кожнага партфеля (няўжо не так?), але ліхтарык ёсць толькі ў кожнага пятага. Пытанне?

Іншае балючае пытанне — моўнае. З тых больш чым чатырох сотень чыстых бланкаў, якія кожны на нашым участку ў адным з новых мікраараёнаў сталіцы атрымаў перад пачаткам перапісу, толькі восем (!) на беларускай мове. Яшчэ пяць я знайшоў сярод сваіх выпадкова. Іх таксама лічылі за рускія, але хтосьці памыліўся. Так, можна спаслацца на тое, што большасць рэспандэнтаў сапраўды будзе адказваць на рускай мове, але калі я, як перапісчык, хачу працаваць з бланкамі на беларускай мове? Адказ ад начальства адзін — бланкаў няма. Зразумела, можна было б узрушыцца, сварыцца і г.д. Але ж гэтае начальства, інструктары, — такія ж, як і перапісчыкі — настаўнікі, лабаранты, служачыя, якіх таксама знялі з працы.

Было б няправільна не расказаць і пра лічбы, якія ну проста абавязкова павінны «плясаць». Перад пачаткам перапісу ў нас былі чатыры дні, каб папярэдне абысці ўсе «свае» кватэры (у сярэднім, дзесьці 120—130 на кожнага), каб сябе паказаць, людзям раздаць паведамленні, што так і так, будзе перапіс, мы можам прыйсці да вас, а можаце і вы на стацыянарны пункт завітаць. Дык вось, калі я паспеў абляцець свой участак за адзін дзень, то ў статыстыцы, якая перадаецца кожны дзень, усё адно гэтая лічба разбіваецца на чатыры дні. Тое самае і падчас перапісу — колькасць пройдзеных кватэр «падганяецца» пад кожны дзень. У чым розніца?! Мая ж задача — перапісаць усіх, а не перапісаць усіх менавіта за адзінаццаць дзён.

Перачытаў усё, што напісаў вышэй, і разумею, што занадта шмат крытычных стрэлаў. Трэба ў канцы дадаць трошачкі пазітыву. А галоўны пазітыў — гэта людзі. У абсалютнай сваёй большасці добрыя, ветлівыя і шчырыя (ды і роднай мовай беларускую лічаць). Спрабуюць накарміць перапісчыка супам і напаіць гарбатай. Здараецца, прапаноўваюць і штосьці больш «гарачае». І часта пытаюцца: «А навошта гэта ўсё? Навошта гэта патрэбна мне, маёй сям'і, маёй краіне? Уся статыстыка, нават больш падрабязная, ёсць у кожным ЖЭСе». Яшчэ адно пытанне... Спадзяюся, толькі пакуль без адказу.

**Яўген ВАРАКСА.**

Тэатральная «Панарама»

# СЕМ КАВАЛКАЎ БУДУЧЫНІ

## «Ружы» і «міны» на шляху маладога беларускага тэатра

Цяпер разумею, чаму ў нашых тэатрах мала ставяць п'ес беларускіх маладых аўтараў... Дзеля таго, каб гэта зразумець, варта было праводзіць праект ON-LINE ў рамках фестывалю «Панарама» менавіта ў такім, як сёлета выглядзе — беларускім. Ужо дзеля таго, каб мы маглі ўявіць, што чакае наш тэатр далей. Каб зразумець сутнасць прэтэнзій тэатраў да прапанаванага моладдзю матэрыялу, і наадварот — прычыны крыўды моладзі з-за таго, што іх не ставяць. Ды каб падтрымалі тых, каму так патрэбная наша ўвага, хто з надзеяй чакае сустрэчы са сваім гледачом. І няхай так будзе: цяпер у эксперыментальным праекце толькі беларуская творчая моладзь, толькі маладыя амбітныя драматургі і рэжысёры! Тым больш, што ў тэатрах нашай краіны адчуваецца патрэба ў прытоку новых арыгінальных ідэй і новых, поўных запалу, людзей. Запалу сапраўды хапіла.



Чаго варта «Дажыць да прэм'еры»? (Актрысы Яўгенія Кульбачная і Алена Сідарава.)

### Маладое — зялёнае

Так кажуць людзі з вялікай жыццёвай практыкай. Але пры гэтым разумеюць, што зялёнае пры спрыяльных умовах можа саспець і набыць смак. Прынамсі, у выглядзе спектаклю, які можа атрымацца.

На сцэне Купалаўскага тэатра ў праекце ON-LINE сёлета глядзелі: сем міні-спектакляў. У кароценькі кавалак аўтарам трэба было ўкласці як мага больш думак, паказаць сваё разуменне сучаснага тэатра, праявіць рэжысёрскае бачанне, пажадана з нейкімі адметнымі знаходкамі. Яны стараліся — рэпеціравалі з артыстамі, нават бліскучымі артыстамі, якія з ахвотай і цікавасцю гатовыя ўвязацца ў розныя эксперыменты. І ў некаторых сапраўды атрымалася! Чамусьці не дзіва, што менавіта ў тых людзей, якія ўжо далучаныя да тэатра, працуюць у ім і разумеюць нюансы гэтага віду мастацтва. Можа таму эпізод «Дажыць да прэм'еры» аўтара Мікалая Рудкоўскага здаваўся абсалютна закончаным спектаклем з фантастычнай іроніяй у дачыненні да акцёрскай прафесіі — рэжысёр Павел Харланчук яе добра засвоіў! Як высветлілася — не толькі яе. Акцёр Аляксандр Казела, напрыклад, запісаўся раптам у драматургі і даверыўся рэжысёру Кацярыне Аверкавай. І калі гэтая пара прапрацуе далей, то ў будучыні можа атрымацца даволі цікавая самастойная мініяцюрка на дзвюх актрыс — маму Зою Белахвосцік і дачку Валянціну Гарцуеву...

Але мы бачылі сем пар: драматург — рэжысёр.

Спачатку яны казалі пра сябе з экрана. Гаварылі пра сваё творчае крэда вельмі правільныя словы: не нашкодзіць, забаўляць ці прымушаць чалавека плакаць у тэатры, і што няма дрэннай драматургіі... Пасля завяршэння падалося, што на экране яны разважалі больш цікава, чым на сцэне.

Даўно заўважыла, што маладыя любяць называць сябе гучнымі словамі: драматург, рэжысёр. Маўляў, я — такі, а калі не ведаеце, то гэта праблема не мая, а тых, хто не пускае мяне да гледача. Што ім дае права так называцца? Напэўна, дыплом, які атрымліваюць у пэўнай навучальнай установе. Ці пэўная колькасць напісаных старонак. Пэўная колькасць прачытаных старонак, якія нехта напісаў, плюс уяўленне, як гэта выглядала б на сцэне. Але сам па сабе дыплом і самыя смелыя мары яшчэ не сведчаць пра тое, што чалавек сапраўды асвоіў прафесію. Вядома, асвоіць яе немагчыма, калі не спрабуеш. Але пасля гэтага on-lin-праекта стала зразумела: спрабаваць трэба тады, калі дакладна ведаеш, што хочаш сказаць.

Бо маладая драматургія павінна суіснаваць з тым нервам, які ёсць у пакалення, адчуваць ягоныя перажыванні, пра іх казаць. І вось нам сказалі, пра што думае моладзь.

Калі меркаваць па сюжэтах, то найбольш часта ў маладых з'яўляюцца думкі пра тое, што хочацца звесці рахункі з жыццём (але незразумела — чаму?), пры гэтым у Пекла на вечныя пакуты не надта хочацца (матывы дзвюх пастановак); пакутуюць яны з-за таго, што перашкаджаюць бацькі і іншыя людзі — у побыце і асабістым жыцці (у дзвюх пастаноўках); імкнуцца пры першым жа выпрабаванні найперш пазбавіцца душэўнага болю любымі шляхамі (2 пастаноўкі)... Ой, а як жа сапраўды жыць, калі ўсё так безнадзейна?..



«Дыялог №» вядуць Зоя Белахвосцік і Валянціна Гарцуева.

### Маладое — амбітнае

Але не веру, што моладзь такая. Не веру, што яна хоча такіх спектакляў пра сябе. Не веру, што малады тэатр мае права быць такім — з прымітыўнымі думкамі, другаснымі, не свежымі ідэямі, на ўзроўні нейкай бессэнсоўнай клаўнады. Не веру, што прыйсці і скарыць сённяя можна тым, што даўно гучала — і на ўзроўні творцаў сусветнага маштабу.

А можа праблема ў тым, што нашы маладыя аўтары пра тое не ведаюць? Ну, не атрымалася, не глядзелі. Не чыталі!?.

Сапраўды, каб рабіць сваё, трэба спачатку чытаць шмат чужога, глядзець тое, што робіцца іншымі і ведаць, які сёння тэатр у іншых краінах. Усё гэта называецца вельмі проста — быць у кантэксце, быць далучаным да тэатральнага працэсу. У гэтым сэнсе бясцэнная любая магчымасць, якая дазваляе прывезці ў Беларусь выдатны тэатр з-за мяжы, у тым ліку на розныя фестывалі. Ужо хоць бы дзеля таго, каб нашы тэатралы маглі на яго пайсці, калі самі не могуць некуды паехаць. Хоць, здаецца, быць «у кантэксце» маладому прасунутаму чалавеку цяпер нескладана, усё залежыць ад жадання — не толькі актыўна і агрэсіўна рэкламаваць сябе, але і вучыцца, шукаць магчымасць стажыровак, удзельнічаць у конкурсах. І спрабаваць разумець тых, хто кажа, што нешта не так.

У тым ON-LINE, што адбыўся сёлета, быў сэнс: каб своечасова жахнуцца, уявіўшы недалёкую тэатральную будучыню, якая можа чакаць беларускі свет, калі нічога не мяняць у выхаванні маладых рэжысёраў і сцэнарыстаў. Калі не ўкладваць у іх падрыхтоўку сродкі і сілы тых, хто рэальна мае дачыненне да прафесіі. Бо калі пусціць усё на самацёк, то цягам часу наш тэатр можа ператварыцца ў аматарскі.

Так, асобныя сюжэты заслугоўвалі ўвагі. Нават здзівілі разуменнем таго, што тэатр — гэта люстэрка грамадства. Сведчанне — тое, што толькі адзін урывак з сямі быў на беларускай мове — «Гусляр» Ігара Скрыпкі і Васіля Дранько-Майсюка — сына вядомага беларускага паэта. Але тэатр — гэта люстэрка, у якім адбіваецца стаўленне людзей да нейкіх з'яў, дзе можна прасачыць, у што можа ператварыцца чалавек, які бясконца ўдасканальвае сваё адчуванне нейкай тэмы. Вядома ж, не ўсе адразу зразумеюць іронію, якая гучала ва ўрыўку «Дажыць да прэм'еры» — усё-такі згадваецца вайна, святая тэма. Вось пра тое, што слова «святая» значыць для нашых сучаснікаў больш, чым само паняцце «вайна», стваральнікі разважалі з дапамогай галоўнай гераіні Яўгеніі Кульбачнай — актрысы, якая гатова сама цярпець нястачы і катаванні, сядзець на хлебе і падрывацца на мінах, каб толькі ўжыцца ў ролю партызанкі. Безумоўна, эксклюзіўны варыянт, не для шырокага прагляду. Зроблена з розумам у постмадэрнісцкай манеры з вялікай доляй гумару і верай у талент.

Таму, калі разабрацца, то ўсё не так безнадзейна. Працягваць у тым жа ключы — і адзінкі бліснуць на наступнай «Панараме», праз год, два, тры... За некалькі гадоў можа атрымацца сур'ёзная кампанія.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
**Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА.**

Слушныя заўвагі спецыяліста:

# У КОЛЬКІ ГАДКОЎ ЛЕПШ АДДАВАЦЬ ДЗІЦЯ Ў САДОК?..

**Апошнім часам стала папулярна як мага раней аддаваць дзіця ў садок. Чым гэта абумоўлена, і на якія асаблівасці варта звярнуць увагу, увогуле, як зразумець, ці гатова дзіця псіхалагічна? Як неабходна яго падрыхтаваць да ўваходжання ў новы калектыў? Вось і паспрабуем знайсці адказы ў спецыяліста — урача псіхатэрапеўта Мінскага гарадскога псіханеўралагічнага дыспансэра Сяргея Іванавіча Цвірко.**

***— Сяргей Іванавіч, як вы лічыце, калі ўсё ж варта адпраўляць дзіця ў садок, у якім узросце?***

— Псіхааналітыкі лічаць, што да пяцігадовага ўзросту выхаваннем дзіцяці лепш займацца дома, бо разам з бацькамі на яго меней уплываюць неўрозы і дэпрэсіі рознага кшталту. Падмурак закладваецца з самага маленства, і таму вельмі важна, каб першыя гады жыцця дзіцяці былі насычаныя пяшчотай і ўвагай, каб дзіця расло і развівалася ў атмасферы добразычлівасці і аднолькавага аўтарытэтнага ўплыву абодвух бацькоў. На характары, у большай ступені, пакідаюць адбітак узаемаадносіны ў сям'і, а толькі пасля дзіцячы садок, школа і іншыя сацыяльныя інстытуты.

***— Якія, на ваш погляд, фактары бацькі павінны ўлічыць пры прыняцці рашэння адправіць дзіця ў садок?***

— У першую чаргу бацькі павінны пільна назіраць за стасункамі свайго дзіцяці з аднагодкамі, як яно сябе паводзіць у такім калектыве. Звычайна, калі дзіця ў пясочніцы дзеліцца вядзёркам, вядзе актыўную палеміку, пазітыўна ставіцца да наяўнасці мноства дзяцей, то, хутчэй за ўсё, яму не хапае ўвагі дома — гэта і ёсць першы сігнал таго, што дзіця падрыхтавана да садаўскага калектыву. На маю думку, дзіцячы садок — адзін са спосабаў усеагульнага і рознабаковага развіцця дзіцяці.

***— І ўсё ж такі, на вашу думку, аптымальны ўзрост для наведвання дзіцячага садка — пяць гадоў? А што тады рабіць бацькам, у якіх няма магчымасці займацца хатнім выхаваннем да такога ўзросту, якія вымушаны пайсці на працу раней і, адпаведна, аддаваць дзіця ў садок?***

— Безумоўна, сённяшні імклівы час, насычаны падзеямі, праблемамі, стрэсамі, дае адбітак і на псіхалагічны стан дзіцяці. Таму, як урач-псіхатэрапеўт, рэкамендую аддаваць дзіця ў садок у столькі гадкоў, у колькі вы, як бацькі, лічыце аптымальным. Таксама раю звярнуцца да спецыяліста (псіхолага, псіхатэрапеўта), якія з дапамогай сучасных методык хутка выявяць, ці падрыхтавана дзіця да садаўскага калектыву. Сёння не складае цяжкасці запісацца на кансультацыю да псіхолага, які спрагназуе хуткасць адаптацыі. У любым выпадку больш карысным для нашых «кветак жыцця» будзе двухгадовая падрыхтоўка да школы ў дзіцячым садку.

***— Псіхолагі лічаць, што толькі ў сямігадовым узросце ўсе функцыі галаўнога мозга сфарміраваны ў поўнай меры. Чаму ж тады, аддаючы дзяцей у 2-3 гады ў садок, мы здзіўляемся, што іх разумовае развіццё крыху запавольненае?***

— Так, толькі бацькі вырашаюць, патрэбны садок іх дзіцяці ці не — гэта і ёсць індывідуальны падыход, але адназначна, што дашкольная ўстанова робіць дзіця значна больш адаптаваным да грамадства, у якім яму давядзецца вучыцца, працаваць, жыць.

Праблемы дзяцей — праблемы сям'і. Калі дзіця не хоча ісці ў садок і кожную раніцу «разводзіць сырасць» — гэта праблема бацькоў, якія не падрыхтавалі належным чынам дзіця да ўваходжання ў дзіцячы калектыў. Бацькам абавязкова неабходна ведаць, што адаптацыя адбываецца ў некалькі этапаў:

- дзіця спачатку пакідаюць у садку на 2-3 гадзіны без бацькоў;
- дзіця застаецца на першую прагулку, на абед, але спаць не кладуць;
- дзіця спіць у садку, пасля чаго яго забіраюць дадому;
- дзіця застаецца да вячэры;
- дзіця, поўнасцю адаптаванае да калектыву, застаецца ў садку да канца працоўнага дня.

Пры гэтым спецыялісты вылучаюць тры формы адаптацыі: цяжкую (больш за адзін месяц дзіця не прымае калектыў, назіраюцца неўрозы, парушэнні сну, павышэнне тэмпературы), сярэднюю (дзіця на працягу аднаго месяца прыстасоўваецца да дзяцей і выхавальніка, нянькі), лёгкую (патрэбна каля двух тыдняў, каб дзіця прызвычаілася да новых умоў жыцця). Адаптацыя да садка залежыць ад псіхалагічнай раўнавагі дзіцяці, ад узаемаадносінаў бацькоў паміж сабой.

Слушная заўвага: цяжкія бацькі, а не дзеці.

**Наталля ГАЛІЕЎСКАЯ.**


г. ВИТЕБСК 30.11.2009

**ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ КАЖДОГО ОБЪЕКТА РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ**

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Здание караульного помещения, расположенное по адресу: Витебская область, Оршанский район, п/о Зубревичи, 1,3 км юго-западнее д. Дубровка, 1/6, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение, инвентарный номер 240/С-30742, одноэтажное кирпичное здание 1956 года постройки общей площадью 165 кв.м, фундамент бетонный, перегородки кирпичные, перекрытия деревянные, крыша рубероидная. Земельный участок с кадастровым номером 223600000001003420 площадью 0,0453 га для обслуживания здания караульного помещения, срок аренды – 50 лет. | 54595 | 5459 |
| 2. | Здание контрольно-пропускного пункта, расположенное по адресу: Витебская область, Оршанский район, п/о Зубревичи, 1,3 км юго-западнее д. Дубровка, 1, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение, инвентарный номер 240/С-20265, одноэтажное кирпичное здание 1980 года постройки общей площадью 8 кв.м, фундамент бетонный, перекрытия ж/бетонные, крыша совмещенная. Земельный участок с кадастровым номером 223600000001003416 площадью 0,0034 га для обслуживания здания контрольно-пропускного пункта, срок аренды – 50 лет. Ограничение в использовании земельного участка в связи с расположением его в охранной зоне линии электропередачи напряжением свыше 1000 В. | 36471 | 3647 |
| 3. | Сооружение специализированное водохозяйственного назначения (пожарный водоем № 1), расположенное по адресу: Витебская область, Оршанский район, п/о Зубревичи, 1,3 км юго-западнее д. Дубровка, 1/9, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение, инвентарный номер 240/С-29287, объемом 100 куб.м, подземное цилиндрическое. Земельный участок с кадастровым номером 223600000001003418 площадью 0,0270 га для обслуживания сооружения пожарного водоема № 1, срок аренды – 50 лет. | 46679 | 4667 |
| 4. | Сооружение специализированное водохозяйственного назначения (пожарный водоем № 2), расположенное по адресу: Витебская область, Оршанский район, п/о Зубревичи, 1,3 км юго-западнее д. Дубровка, 1/8, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение, инвентарный номер 240/С-29288, объемом 100 куб.м, подземное цилиндрическое. Земельный участок с кадастровым номером 223600000001003417 площадью 0,0238 га для обслуживания сооружения пожарного водоема № 2, срок аренды – 50 лет. | 45295 | 4529 |
| 5. | Сооружение специализированное водохозяйственного назначения (пожарный водоем № 3), расположенное по адресу: Витебская область, Оршанский район, п/о Зубревичи, 1,3 км юго-западнее д. Дубровка, 1/10, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение, инвентарный номер 240/С-29289, объемом 100 куб.м, подземное цилиндрическое. Земельный участок с кадастровым номером 223600000001003419, площадью 0,0212 га для обслуживания сооружения пожарного водоема № 3, срок аренды – 50 лет. | 44170 | 4417 |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон-факс в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail: fondvitebsk @tut.by.**

**ПРОДАВЕЦ – учреждение «База-хранилище государственного страхового фонда документации Республики Беларусь», тел. (0216) 297210.**

Условия продажи объектов недвижимости: осуществление покупателями предпринимательской деятельности на данных объектах, создание ими дополнительных рабочих мест; запрещение покупателям продажи, иного отчуждения объектов до выполнения условий договоров купли-продажи.

**Условия пользования земельными участками:** не позднее двух рабочих дней после внесения денежных выплат и выполнения условий, указанных в протоколе о результатах аукциона, заключить с Оршанским райисполкомом, действующим от имени облисполкома, договор аренды земельного участка; осуществить государственную регистрацию права на земельный участок в двухмесячный срок со дня заключения договора аренды; получить в установленном порядке разрешение Оршанского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта производственно складского назначения в срок, не превышающий двух лет; в течение шести месяцев с момента утверждения в установленном порядке проектно-сметной документации на строительство объекта приступить к занятию данного участка; осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

**1. Аукцион состоится 30 ноября 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

Для участия в аукционе приглашаются: юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица, копия документа, подтверждающего государственную регистрацию, **без нотариального засвидетельствования;** индивидуальными предпринимателями – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, **без нотариального засвидетельствования;** иностранными юридическими лицами – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 27.11.2009 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 30.11.2009 с 14.00 до 14.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

**3. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.**

4. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

**5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения райисполкомом), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 2 миллиона рублей по каждому лоту, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

**6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.**


Ведай нашых!

# ГОМЕЛЬСКІ ШКОЛЬНІК МОЖА ДАЦЬ СТУДЭНТАМ МАЙСТАР-КЛАС

**Пераканаўчай перамогай студэнтаў Белдзяржуніверсітэта завяршыліся XII чвэрцьфінальныя спаборніцтвы Заходняга рэгіёна каманднага чэмпіянату свету па праграмаванні сярод студэнтаў універсітэтаў. Спаборніцтвы праходзілі на базе Белдзяржуніверсітэта, а барацьба ў чвэрцьфінале ішла сярод 48 камандаў з 21 універсітэта Беларусі, Латвіі, Літвы, Эстоніі і Калінінградскай вобласці Расійскай Федэрацыі.**

Па выніках чвэрцьфіналу першыя чатыры месцы занялі каманды БДУ, далей за імі размясціліся каманды БДУІР, Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта, Дзяржаўнага ўніверсітэта імя Канта з Калінінграда і дзве каманды Латвійскага ўніверсітэта. А замкнула дзясятку яшчэ адна (пятая) каманда студэнтаў БДУ. Удзельнікам спаборніцтваў было прапанавана 12 задач, якія трэба было рашыць на працягу 5 гадзін асноўнага тура спаборніцтваў. Па дзейных правілах усім удзельнікам прапануецца аднолькавы набор задач, а перамагае тая каманда, якая рашыць найбольшую колькасць задач за больш сціслы тэрмін.

Сёлета Заходняму рэгіёну было выдзелена 14 пуцёвак на паўфінальныя спаборніцтвы чэмпіянату свету, якія адбудуцца ў лістападзе ў Санкт-Пецярбургу. Па рашэнні міжнароднага аргкамітэта чэмпіянату свету, ад аднаго ўніверсітэта на паўфінальныя спаборніцтвы змогуць паехаць не больш як дзве каманды, акрамя каманды БДУ, якая можа быць прадстаўлена ў паўфінале трыма сваімі камандамі.

Такім чынам у паўфінале чэмпіянату свету будуць выступаць 6 беларускіх студэнцкіх камандаў: 3 каманды ад Белдзяржуніверсітэта, 2 каманды ад БДУІР і адна каманда ад Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Чвэрцьфінальныя спаборніцтвы чэмпіянату свету па праграмаванні сярод студэнтаў, якія прайшлі на базе Белдзяржуніверсітэта, былі адметныя яшчэ і тым, што ўдзел у іх, праўда, па-за конкурсам, узяў вучань 9-га класа гомельскай гімназіі № 56 Генадзь Караткевіч — абсалютны чэмпіён свету па інфарматыцы сярод школьнікаў узору 2009 года. Юнак і тут прадэманстраваў цудоўныя вынікі, рашыўшы такую ж колькасць, што і студэнты, прычым больш хутка, чым яго супернікі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «БЕЛАРУСЫ ЗДЗІЎЛЯЮЦЦА...»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

Я запытаў, хто яшчэ з беларускіх знакамітасцяў ім вядомы. Сербы адказалі, што крышку чыталі беларускіх пісьменнікаў, таму найперш гэта Максім Багдановіч і Якуб Колас. Ведаюць таксама Францыска Скарыну і Ефрасінню Полацкую.

— І Дзіяна Гурцкая, — дадае ў канцы Ураш. — У яе тата — з Беларусі, значыць і яна беларуска.

* * *

— Я яшчэ не ведаю дакладна, кім я стану, — прызнаецца Алівера Праліца. — Мне падабаецца праца выкладчыка, таму цалкам магчыма, што я буду выкладаць сербскую мову для беларусаў.

— Яны вельмі здольныя студэнты, мне вельмі падабаецца з імі працаваць, — працягвае Святлана. — Хацелася б, каб больш увагі было да іх. Бо яны першыя сербскія беларусісты, альбо, як мы іх называем, «сербскія беларусікі».

Сербскія студэнты ў Беларусі толькі на тры тыдні. І тут іх вучэбны план складзены такім чынам, каб больш поўна пазнаёміць гасцей з беларускай мовай і культурай. Сербы, як і беларускія філолагі, таксама наведваюць БДУ. Толькі вучэбны план у іх своеасаблівы: беларуская мова выкладаецца як замежная.

***— Як рэагуюць на беларускамоўных сербаў беларусы?***

— Калі мы прыходзім у розныя ўстановы, усе ў захапленні, — кажа Святлана. — Вітаюць вельмі цёпла. І паўтараецца такая думка, каб усе беларусы былі такімі свядомымі і ў свой вольны час удасканальвалі сваю беларускую мову... На вуліцы (у краме, напрыклад) вельмі часта нас сустракаюць здзіўленнем, часам не ведаюць, на якой мове адказваць. Яны былі ўжо падрыхтаванымі, таму асабліва рускамоўнае акружэнне ў Беларусі іх не здзіўляла. Ім увогуле вельмі падабаюцца людзі — гэта самае моцнае ўражанне. Нават кажуць, што ім тут нават лепш, чым у Расіі: настолькі цёплы і адкрыты ў нас народ, што адразу ідзе сяброўства.

***— А з якой перыядычнасцю на філалагічным факультэце БДУ ажыццяўляецца набор на аддзяленне «сербская мова»?***

— Наш факультэт, якому сёлета спаўняецца 70 гадоў, спецыяльнасць «сербская мова і літаратура» адкрыў з 1997 года. На факультэце набор па спецыяльнасці «сербская мова» ажыццяўляецца кожныя чатыры гады, таму сёлета поруч з чацвёртым курсам асновы сербскай мовы спасцігаюць і першакурснікі.

***— Ці плануецца нешта накшталт цэнтра па вывучэнні сербскай мовы ў будучыні?***

— Наша кафедра (тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства) і наш факультэт шмат робяць для таго, каб адчыняць цэнтры такога кшталту. У нас на факультэце пры падтрымцы пасольстваў адчыняць адмысловыя кабінеты. У апошні час, напрыклад, быў адчынены кабінет паланістыкі, украінскай мовы і літаратуры, чэшскай мовы і літаратуры, італьянскай і г.д. Ужо шмат зроблена, каб стварыць кабінет паўднёваславянскай філалогіі. У падарунак нават атрымалі кнігі ад Нацыянальнай бібліятэкі Сербіі менавіта для гэтага цэнтра. І цяпер спадзяёмся, што такі цэнтр будзе працаваць. Цэнтр сербістыкі, куды кожны зможа прыйсці, калі яго што-небудзь зацікавіць. Там будуць стаяць сербскія кнігі, фільмы і адмысловы каталог. І туды мы будзем запрашаць усіх ахвотных.

***— Поспехаў вам і ўдачы!***

**Ілья ЛАПАТО. Фота аўтара.**

Тэлесеткі

# У ТЭЛЕВІЗІЙНЫ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ КЛУБ ЗАПІСАЛІСЯ «ЗОРКІ»

**Алімпійскі чэмпіён, вядомы кінарэжысёр, папулярныя артысты і капітан чэмпіёнскай каманды КВЗ прымерыліся да крэслаў знаўцаў у беларускай версіі «Што? Дзе? Калі?»**

У восеньскай серыі, якую мы ўбачым пачынаючы з 27 кастрычніка, адна гульня з шасці будзе незвычайная — дабрачынная. Усе грошы, якія ўдасца зарабіць знаўцам (кожнае пытанне, нагадаем, «цягне» на 500 тысяч рублёў), накіруюцца ў дзіцячы дом. Адпаведна і каманда, якой выпала гэта добрая місія, падабралася незвычайная — «зорная». За «круглы стол» на месцы знаўцаў паселі дызайнер Уладзімір Цэслер, былы капітан каманды КВЗ, цяпер сцэнарыст і прадзюсар Леанід Купрыда, спявачка Алёна Свірыдава, алімпійскі чэмпіён па веславанні на байдарках Аляксандр Багдановіч, спявак і тэлевядучы Георгій Калдун, а таксама рэжысёр Дзмітрый Астрахан (апошні хоць і расіянін, але па частаце знаходжання ў Мінску яго таксама ў самы час запісваць у лік землякоў).

Пра тое, якім чынам адбіралі ўдзельнікаў «зорнай» зборнай і ці быў увогуле нейкі кастынг, або ўзялі ўсіх ахвотных, мы распыталі вядучага праграмы Алеся Мухіна.

— Мы вырашылі сабраць у адной камандзе папулярных асобаў, якія цесна звязаныя з Беларуссю, так што выпадковых людзей тут няма, — запэўніў Алесь. — Дарэчы, усе яны па сакрэце расказалі мне, што марылі калі-небудзь паўдзельнічаць у інтэлектуальных гульнях, таму з задавальненнем адгукнуліся на нашу прапанову. І ўсё ж мы моцна рызыкавалі, калі фарміравалі каманду, бо падабраліся людзі розных узростаў і прафесій, таму па псіхатыпах яны маглі не супасці. Але, на мой погляд, склаўся вельмі ўдалы «пазл», атрымаўся не проста набор людзей, а менавіта каманда. Я нават не выключаю, што калі гуляць ім спадабаецца, яны зноў збяруцца гэтым самым складам.

На папярэдніх трэніроўках, адзначылі ў тэлегрупе, кожны пацвердзіў сваю адметнасць і карысць для каманды. Напрыклад, Аляксандр Багдановіч вызначыўся хуткасцю рэакцыі і ўменнем вокамгненна прымаць рашэнне, Уладзімір Цэслер пытанні... замалёўваў, што часта падштурхоўвала каманду да правільнага адказу, Алёна Свірыдава выступала чалавекам-генератарам, падкідваючы каштоўныя ідэі, а Леанід Купрыда, абраны капітанам, прадэманстраваў уменне чуць усіх і кожнага.

— Насамрэч я капітан выпадкова, кожны мог быць на гэтым месцы, — разважаў Леанід у перапынку. Але пры тым прызнаўся, што асабіста ён глядзіць «Што? Дзе? Калі?» з дзяцінства, яшчэ з тых часоў, калі там гулялі на кнігі, а не на грошы. — Мой любімы гулец — Нуралі Латыпаў, я стараўся не прапускаць ніводнай перадачы, тым больш з яго ўдзелам. А цяпер Алесь Мухін зрабіў мне прапанову, ад якой я не здолеў адмовіцца — згуляць самому. Мы нацэлены на перамогу, але не страшна і прайграць, бо ў любым выпадку дапаможам дзецям. Адзіная складанасць для мяне — хочацца ў першую чаргу даць смешны адказ, бо я гэтым займаюся ўсё свядомае жыццё, — але трэба даць правільны!

Сапраўды, на размінках Леанід нястомна весяліў сваю каманду, узгадваючы старую КВЗшную сцэнку: «Ты ж не можаш адказаць «Таму, што гладыёлус?» — «Магу!». Але гэтыя жарты нікольки не змяншалі агульны баявы дух, толькі дадавалі бадзёрасці ды адрэналіну.

Для Алёны Свірыдавай тэлеканал АНТ падрыхтаваў асобны сюрпрыз — яе ж уласны хіт «Ружовы фламінга», але выкананы... на палескім дыялекце! Пачуўшы гэту нязвычную версію ў выкананні ўдзельнікаў тэлепраекта «Песні маёй краіны», гурт «Хмелеўскія валацугі», спявачка здзіўлена акругліла вочы і пачала хутка нешта занатоўваць у блакноце. «Мабыць, словы для сябе запісвае», — падумалі мы.

— Не, — рассмяялася Алёна, — я малявала птушку. Але сюрпрыз мне надзвычай спадабаўся — нават была думка выйсці падпець, але вырашыла не адбіраць лаўры ў выканаўцаў. Спачатку падалося, што песня перакладзеная на ўкраінскую мову — палескі дыялект вельмі прыгожы і больш мяккі, чым тая беларуская, да якой я прывыкла...

Ці збіў з панталыку Алену Свірыдаву гэты падарунак або дадаў упэўненасці ў сабе, ці дапамог Георгію Калдуну досвед вядучага інтэлектуальнай гульні «Адзін супраць усіх» знаходзіць правільныя адказы, ці пагадзіўся Уладзімір Цэслер распрацоўваць новы вобраз хрустальнай савы і ці многа ў рэшце рэшт зарабілі «зорныя» гульцы для дзіцячага дома — даведаемся ўжо зусім хутка, 31 кастрычніка.

А на падыходзе ўжо чарговая, зімовая серыя гульняў, у якой арганізатары абяцаюць прадставіць як мінімум адну новую каманду, а таксама мяркуюць працягнуць традыцыю музычных паўз у народным і класічным стылі. Як расказалі рэдактары праграмы, многія папулярныя выканаўцы ўжо нават у чаргу выстраіліся, каб выканаць у беларускім клубе «Што? Дзе? Калі?» класічныя творы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Уладзіслаў МЕЦЕЖ, намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта:

# «ЁСЦЬ УСЕ ПЕРАДУМОВЫ ДЛЯ ТАГО, КАБ СЁЛЕТА ЎЗВЕСЦІ 6 МЛН «КВАДРАТАЎ» ЖЫЛЛЯ»

**Удзельная вага будаўніцтва ў валавым унутраным прадукце сёлета па выніках студзеня—верасня склала 11,5 працэнта. Гэта на 2,1 % больш, чым за мінулы год.**

Тлумачыцца ўсё проста: аб'ёмы будаўніцтва ўвесь час павялічваюцца. Не стаў выключэннем і гэты год: як паведаміў намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Уладзіслаў Мецеж, за дзевяць месяцаў было ўведзена ў эксплуатацыю больш чым 4,5 мільёна квадратных метраў агульнай плошчы жылля. Пры гэтым у Брэсцкай вобласці здадзена 718,7 тыс. кв.м (на 16,5 працэнта больш, чым за адпаведны перыяд летась), у Віцебскай — 435,1 тыс. кв.м (14,4 %), у Гомельскай — 622,1 тыс. кв.м (19,9 %), у Гродзенскай — 569,6 тыс. кв.м (18,2 %), у Мінскай — 892,3 тыс. кв.м (17,6 %), у Магілёўскай вобласці — 478 тыс. кв.м (32 %).

У сталіцы пабудавана 805,3 тыс. «квадратаў», але адпаведны паказчык практычна адпавядае леташняму ўзроўню (рост склаў толькі 0,3 працэнта). Прычым гэта складае толькі 57,5 % ад гадавога задання, якое, паводле слоў Уладзіслава Мецежа, у сталіцы наўрад ці будзе выканана. Аднак, запэўніў намеснік старшыні Нацыянальнага статкамітэта, ёсць усе перадумовы для таго, каб сёлета ўвогуле па краіне ўзвесці 6 мільёнаў «квадратаў» жылля. Гэты паказчык перавысіць узровень 1991 года, калі пабудавалі 5,3 млн кв.м. Калі ў 2000 г. было здадзена 3,5 млн кв.м, у 2005-м — 3,7 млн, у 2002-м — 4,08 млн, то летась — ужо 5,1 млн «квадратаў».

Сёлета за студзень—верасень уведзена ў эксплуатацыю 854 кватэры сацыяльнага карыстання, 564 — для адсялення людзей, якія жывуць у вельмі зношаным і аварыйным жыллі, і больш чым 2,8 тысячы кватэр для шматдзетных сем'яў. Актыўна разгортваецца жыллёвае будаўніцтва ў вёсцы. Як заўважыў Уладзіслаў Мецеж, жыхарам глыбінкі па ўзроўні камфорту неабходна стварыць тыя ж умовы, што і гараджанам. За дзевяць месяцаў у вёсцы пабудавана 1,2 млн кв. метраў жылля. Амаль палову агульнага паказчыка (545,5 тыс. «квадратаў») забяспечыла Мінская вобласць. На Брэстчыне ў глыбінцы ўзведзена 189,1 тыс. кв.м, на Віцебшчыне 111,8 тыс., на Гомельшчыне — 145,3 тыс., на Гродзеншчыне — 120,2 тыс., на Магілёўшчыне — 119,1 тыс. кв.м.

Як адзначыў Уладзіслаў Мецеж, апошнім часам актывізавалася індывідуальнае будаўніцтва. За дзевяць месяцаў такім чынам пабудавана 1,6 мільёна «квадратаў» жылля. Прычым у агульным аб'ёме на долю індывідуальных забудоўшчыкаў прыпадае больш чым трэць — 35,5 %. Гэта ў сярэднім, а ў Мінскай вобласці індывідуальнае будаўніцтва займае 61,1, у Брэсцкай — 48,6 працэнта. Увогуле Беларусь па-ранейшаму застаецца на постсавецкай прасторы лідарам па аб'ёмах будаўніцтва жылля ў разліку на 1 тысячу жыхароў. У нашай дзяржаве гэты паказчык летась склаў 527 «квадратаў». У той час у Расіі выходзіла 451 кв.м, у Казахстане — 434, у Азербайджане — 215, у Арменіі — 161, у Кыргызстане — 158, у Малдове — 190, у Таджыкістане — 103, ва Узбекістане — 265, ва Украіне — 228 кв.м.

Дарэчы, адзначыў Уладзіслаў Мецеж, у Беларусі застаецца пэўная колькасць няўлічанага жыллёвага фонду. Так атрымліваецца з-за таго, што асобныя жыхары не рэгіструюць тэрмінова сваю нерухомасць пасля ўвядзення дома ў эксплуатацыю. Дарэчы, гэтую інфармацыю мяркуецца ўдакладніць падчас цяперашняга перапісу насельніцтва.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

ЯК НАС ДУРАЦЬ

## ТАКІ ВОСЬ ВЫЙГРЫШ

**29-гадовая жыхарка Баранавічаў на свой мабільны тэлефон атрымала SMS з віншаваннем аб выйгрышы аўтамашыны «БМВ-Х5»**

Дзяўчына патэлефанавала на нумар расійскага тэлефона, які быў названы ў SMS, і мужчына адказаў, што сапраўды кампанія Gold Motors разыграла аўтамабіль, у выніку чаго камп'ютар выбраў яе тэлефон. «БМВ», быццам бы, каштаваў 80 тыс. долараў, і дзяўчыне неабходна было заплаціць падаткі у памеры 28 тыс. долараў. Пачуўшы, што такіх грошай няма, голас з Масквы прапанаваў заплаціць каля двух тысяч і зняцца ў рэкламным роліку. Пераможца «конкурсу» сказала, што заплаціць, калі ёй даставяць аўтамашыну, але яе ўгаварылі, бо фірма дужа салідная і голас у тэлефоне быў сур'ёзны.

Дзяўчына пералічыла на рахунак інтэрнэт-кашалька сістэмы web-money 1920 долараў і пачала чакаць машыну. Прайшло некалькі дзён. Усвядоміўшы, што яе ашукалі, дзяўчына пайшла ў міліцыю. А там высветлілі, што долары з інтэрнэт-кашалька былі пералічаныя на іншыя рахункі і зніклі. Цяпер адна надзея, што дапамогуць знайсці махінатараў расійскія міліцыянеры.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## КАЛІ ГРУБКІ НЕ Ў ПАРАДКУ

У хаце беспрацоўнай з г/п Целяханы знайшлі мёртвай 10-гадовую дзяўчынку, якая знаходзілася ў гасцях. Вялікая верагоднасць, што яна атруцілася чадным газам. Гаспадыня таксама пацярпела і знаходзіцца ў рэанімацыі.

І ў вёсцы Навасёлкі Лунінецкага раёна ад чаднага газу загінуў пенсіянер. Прычына адна — не ў парадку грубкі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## У ЛОНДАНЕ МОЖНА ПАЕСЦІ ЗОЛАТА

**Да традыцыйнага спісу ядомых тавараў на гэтым тыдні дадалі яшчэ адзін — золата.**

У адной з самых папулярных і буйных сталічных крамаў Лондана пачалі прадаваць ядомае золата. Яно ўяўляе сабой створаную спецыяльным чынам найтанчэйшую 23-каратную залатую плёнку. Улады, якія кантралююць стан харчовага рынку краіны, выдалі ліцэнзію на новы від золата, які можна ўжываць у ежу. Залатымі лістамі ў Лондане пакрываюць піражныя і іншыя дэсертныя стравы, а таксама цукеркі. Прадаюцца і залатыя канфеці, якія раяць дадаваць у келіх з шампанскім.

Залатыя і сярэбраныя лісты прадаюцца ў каробцы коштам 15,99 фунтаў стэрлінгаў ($25,58). У яе ўваходзяць два залатыя і два сярэбраныя прамавугольнікі плошчай у 5 кв. см кожны. Асаблівым попытам новы прадукт карыстаецца цяпер у дарагіх рэстаранах. Так, у меню аднаго з іх уключана курыца, цалкам пакрытая золатам. Замовы на пастаўку буйных партый ядомага золата паступілі ўжо з Нью-Ёрка, Токіа і Парыжа. Адначасова выпушчана і сярэбраная разнавіднасць гэтага найноўшага прадукту харчавання.



Тайбаксёр Віталь ГУРКОЎ:

# «На перапісе назваў роднай мовай беларускую»

Сёння ўначы знакаміты беларускі баец пазмагаецца за тытул чэмпіёна Еўропы сярод прафесіяналаў у Казані

Гуркоў — самы тытулаваны баец нацыянальнай зборнай Беларусі. Ніводнага двубоя не прайграў на чэмпіянатах свету. Здабыў шэсць залатых медалёў. Ды ў Казані нашаму чэмпіёну давядзецца біцца з Уралбекам Есенкулавым, які на працягу турніру ўжо здолеў перамагчы двух знакамітых байцоў — расіяніна Аляксандра Морава (экс-чэмпіён свету) і беларуса Юрыя Гарбачова (прызёр чэмпіянату свету). Да двубою з Гурковым Уралбек рыхтуецца як апошні раз у жыцці.

— *Двубой будзе пяціраўндавы, не ўпэўнены, што ў яго хопіць сілаў каб пратрымацца да канца і ўратаваць сваю левую нагу, куды ён стабільна прапускае ўдары,* — выказаўся Віталь Гуркоў «Звяздзе» на платформе сталічнага чыгуначнага вакзала перад адпраўленнем.

У разгар перапіснай кампаніі не маглі мы не спытацца ў чэмпіёна, ці паспеў да яго завітаць чалавек з зялёным «чамаданчыкам».

— *Вядома, паспеў, хоць жыву я разам з бацькамі ў катэджы пад Мінскам,* — усміхнуўся чэмпіён. — *Роднай мовай я пазначыў беларускую. І бацькам загадаў не падманваць сябе і выбраць матчыну мову.*

Чэмпіянат Еўропы ў версіі TNA спачатку не прэтэндаваў называцца аўтарытэтнымі спаборніцтвамі. Ды багатыя бізнэсмены з Казані, якія маюць дачыненне ды хакейнай каманды «Ак-Барс» (адзін з лепшых клубаў КХЛ) і футбольнай — «Рубін» (чэмпіён расійскай Прэм'ер-лігі), уклалі грошы і запрасілі на турнір суперзорак: перш-наперш абсалютнага чэмпіёна свету па кікбоксінгу беларуса Дзмітрыя Шакуту, Віталя Гуркова, расіяніна Арцёма Левіна і галандца Эшвіна Балрака. Фіналы праз нейкі час будуць трансляваца па тэлеканале «Еўраспорт».

Не абышлося на турніры і без скандалаў. Беларускі суперцяжкавагавік Ігар Бугаенка пасля перамогі ў чвэрцьфінале адразу пасля свайго двубою самавольна ўладкаваўся ў віп-ложу непадалёк ад арганізатараў турніру. Ігара з віп-ложы папрасілі, маўляў, як ты наважыўся сесці побач з такімі высокімі людзьмі. Ігар, пакуль не даглядзеў двубой, з месца не скрануўся.

— *Для нас як для еўрапейцаў гэта стала нечаканасцю,* — распавядае найстарэйшы трэнер зборнай Беларусі Дзмітрый Пясецкі. — *У Беларусі спартсменаў паважаюць, а не ставяцца да іх, як да абслугі. Таму арганізатары атрымалі ад нашых хлопцаў адлуп. Беларусаў вырашылі пакараць штрафам. Тады абсалютны чэмпіён свету Дзмітрый Шакута ўвогуле адмовіўся ад ганарару, і грошы нашай камандзе былі вымушаны вярнуць.*

Тым не менш, скандал пакінуў адбітак. І ў фінале Віталю Гуркову разлічваць на прыхільнасць суддзяў не даводзіцца, Есенкулава давядзецца накаўтаваць. Іначай перамогу могуць аддаць у іншы бок.

Тытулы чэмпіёнаў Еўропы ў версіі TNA будуць аспрэчвацца ў трох вагавых катэгорыях.

Спачатку ў вазе **70 кг** сустрэнуцца Віталь Гуркоў і Уралбек Есенкулаў. Потым у вазе **80 кг** — расіяне Арцём Левін і Аляксандр Сцецурэнка. Дарэчы, усе спецыялісты разлічвалі тут на перамогу беларуса Дзмітрыя Шакуты. Але на паўфінал Дзіма прыехаў траўмаваны, з разбітымі нагамі і рукамі пасля абароны тытулу чэмпіёна свету. І прайграў Арцёму Левіну. Расійскія журналісты трыўмфавалі і пісалі некарэктныя матэрыялы, дзе пра траўмы Дзмітрыя Шакуты ніхто не ўзгадаў. Матч-рэванш не за гарамі. У суперцяжкай вазе **(звыш 91 кг)** павінны сустрэцца галандзец Эшвін Балрак і расіянін Сямён Шэлепаў. Але апошні днямі атрымаў траўму і можа не ўзнавіцца да фіналаў. Калі спатрэбіцца, Шэлепава заменіць беларус Ігар Бугаенка.

**Яўген ВАЛОШЫН.**

Асабістая думка

# «НЕ НАРАКАЙЦЕ НА НАРОД БЕЛАРУСКІ»

## (Зацемкі беларускамоўнага перапісчыка)

У 1898 годзе ў Смаленскай вобласці беларусамі запісалася болей за 80 % насельніцтва. Пры сёлетнім перапісе ў Беларусі я ведаў звесткі папярэдніх перапісаў у незалежнай Беларусі. Калі мусіў быць перапісчыкам, вельмі хваляваўся. Турбавала, не давала спакойна спаць адна думка — як мае беларусы перапішуцца сёлета.

Напрыканцы перапіснай кампаніі з гонарам заяўляю: я ганаруся табою, люд беларускі.

...Перапіс для нас, студэнтаў БДУ, пачаўся з інструктажоў у аўдыторыях і з папярэдніх абыходаў. Да 14 кастрычніка перапісчыкі мусілі абысці адведзеныя кватэры, запытаць у людзей зручны для іх дзень перапісу, даведацца пра колькасць чалавек у кватэрах, на якой мове лепей іх перапісваць.

Асабліва вялікага сэнсу папярэдняга абыходу я не бачыў, як і шматлікія мае калегі. Тым не меней разумелі, дзяржаве патрэбна дакладнасць і масавасць. Абыходы не пашкодзілі.

Людзі ахвоціліся адказваць на нашы пытанні, не адразу разумелі, навошта прыйшоў перапісчык да іх, калі не збіраецца перапісваць. Усіх людзей падчас папярэдняга абыходу не абышлі, гэта і не патрэбна было. Галоўнае, наведаць па магчымасці кожную кватэру ў перыяд з 14-га да 24-га.

Перапісам быў заняты ўвесь паток нашага трэцяга курса. Мы атрымалі цэлы кастрычнік без вучобы, але з праязным на ўсе віды транспарту. Асобныя прадметы будзем здаваць пазней, гэта нас засмуціла. Заробак — чатыры базавыя велічыні (150 тысяч).

Асабіста мне было цікава атрымаць падобны досвед, правесці ўласныя падлікі, пагутарыць з людзьмі. Новай працы радаваўся. Хоць засмучалі некаторыя моманты.

Не хапала беларускіх бланкаў. На нашым інструктарскім участку працавала некалькі беларускамоўных перапісчыкаў. Нам цяжка было запытваць людзей па-руску. Прыблізна чатыры працэнты людзей прасілі мяне звяртацца да іх па-руску. Згаджаўся. Мне цікава гутарыць з людзьмі, што жывуць на беларускай зямлі, а мову гэтай зямлі не прымаюць, нібы не ведаюць, што ў любой дзяржаве ў любую эпоху мова не толькі сродак стасункаў.

Нам паведамілі, што бланкаў на беларускай мове надрукавалі няшмат, мяне прасілі іх эканоміць, пакідаць на выпадкі, калі людзі самі папросяць. На выбар бланкі не прапаноўваць.

У сувязі з гэтым узгадваецца выпадак па вуліцы Мележа. Чалавек прыйшоў на перапіс 14 кастрычніка ў перапісны пункт. Адказаў на некалькі пытанняў, тады толькі выявіў, што пытанні даюць на рускай мове. Спытаў, чаму не прапанавалі бланкі на выбар. Усе чатыры перапісчыцы ў голас заявілі, што беларускамоўныя бланкі пакуль не прынеслі. Чалавек заявіў, што пойдзе пісаць скаргу ў гарвыканкам. Беларускамоўныя бланкі адразу знайшліся. Перапісчыца і астатнія сталі гаварыць па-беларуску. Развіталіся людзі мілымі сябрамі.

Заўважу пры гэтым, так званыя «Кантрольныя фішкі» (патрэбныя, каб чалавека двойчы не перапісалі ў дзвюх кватэрах), «Кантрольна-перапісны ліст» (пры адсутнасці рэспандэнта) і шэраг іншых папер былі толькі на рускай.

У першы дзень перапісу мы фактычна знаёміліся з працай, вучыліся без памылак запаўняць аркушы. Справа рухалася марудна. Абышоў усяго пяць кватэр — працоўныя людзі, пенсіянеры.

Значную частку кватэр наведаў у суботу і нядзелю. За выхадныя пацвердзілася тое ж, марудна ідзе праца. За дзевяць гадзін толькі 25 кватэр. У першыя дні на кватэру прыходзілася 25 хвілін, у апошнія — 21. Вядома ж, выдаткоўваўся час на дарогу да наступнай кватэры, перапіснога ўчастка, перамовы па дамафонах, званкі ў кватэры. У асобныя даводзілася хадзіць па тры-чатыры разы, каб застаць жыльцоў.

Адчуваўся патрыятызм насельніцтва. Людзі смела, з гонарам называюць сябе беларусамі. Ніколі раней не чуў столькі адказаў «шчыры беларус», «чысты беларус», «у нас уся сям'я беларуская», пакуль не пачаў працаваць перапісчыкам. Гэтыя ціхія паўсюдныя прызнанні — адно з вялікіх маіх адкрыццяў.

Большасць сталых не саромеліся адказваць, што размаўляюць на трасянцы. Сучасная моладзь, наадварот, выступае за чысціню мовы — беларускай ці рускай.

Многія наракалі на тлумнасць дробных літараў бліз пытання Родная мова (што гэта такое — мова, засвоеная першай у раннім дзяцінстве? А чаму б не папытаць, якая мова ў чалавека была ў пятым класе, дзясятым? Такое пытанне, сцвярджалі, нідзе ў свеце не практыкуецца.)

Раней у перапісных лістах было пытанне пра веравызнанне, цяпер яго няма. Не ведалі, што пра гэта думаць.

Людзі не разумеюць навошта адказваць на пытанні «Ці маеце камп'ютар?», «Ці падключаны ён да інтэрнэту?». Адзін юнак з Маскоўскага раёна скардзіўся, у яго рускамоўныя паненкі зусім не папыталі пра родную мову, можа запісалі руская. Знаёмы распавядаў пра дзяўчыну, якая не мела ні аднаго беларускамоўнага бланка, ён адмовіўся перапісвацца, «дзяўчына сімпотная, хай яшчэ раз зойдзе».

З кожным днём перапісу ўсё больш адчуваў гонар за беларускую нацыю. Затурканыя, знешне абыякавыя людзі, нягледзячы на шматгадовыя пакуты ўласнае мовы, ведаюць сваю адметнасць, беларушчыну. Некаторыя на пытанне пра родную мову давалі адказ, кшталту «Запишите белорусский. Может, хоть больше людей по-белорусски разговаривать будет». Асобныя разам са мною пераходзілі на беларускую. Сустрэлася і такое: адказваючы на чысцюткай беларускай мове, хлапец гадоў дваццаці назваў роднай мовай сваёй і сям'і рускую.

Мноства людзей успрымалі беларускае маўленне як абавязак перапісчыка. «Если трудно, можете говорить по-русски», — вымавіла прыемная салідная жанчына, думала, відаць, што мы абавязаны мець стасункі па-беларуску.

«Не надо цурацца роднай мовы, добра, не выракаецеся яе», — бабулька не заўважае, што сама ўжывае рускае слова, пачаставала яблыкамі.

Людзі любяць пагутарыць, могуць абгрунтаваць адказ на пытанне, падзяліцца болем, гонарам, ведамі. Апавядалі пра вёску, дзе за год сорак чалавек памерла, адзін нарадзіўся. Пачуў жахлівы аповед пра жанчыну, якая пайшла ў запой на пяць тыдняў і яе на ўзлеску з'елі чарвякі.

Увогуле, гарэлка — асобная тэма ў народзе. Чалавек кінуў піць, забаранілі дактары, другі, не звяртаючы ўвагі на парады медыкаў, піў па бутэльцы ў дзень (працаваў шафёрам), як вынік — неўзабаве загнуўся.

Напаткаў розных людзей. Некаторыя валодаюць англійскай мовай... і не ведаюць дзень нараджэння маці.

— Я сваю мову не ведаю, дзе ўжо мне замежнымі валодаць, — зазначыў слесар ЖРЭА.

Размаўляючы пра крыніцы існавання, жанчына-настаўніца ўспомніла выслоўе «Як маеш грошы, то і сам харошы».

Хоць у гэтым дзевяціпавярховіку за год абрабавалі трыццаць пяць кватэр, людзі дужа ветлівыя, рэдкія з асцярогай запытваюць пасведчанне. За ўвесь час на мяне толькі адна старая накрычала (абяцаў прыйсці вечарам, прысунуўся ўдзень), аднак пасля цукеркамі пачаставала, сказала, баялася перапісвацца, калі мужа не было ў хаце.

Асноўны націск у сваёй працы я рабіў на 15—18 кастрычніка. У абед 18-га ў мяне было 61,7 % апытаных кватэр. Дадам, на маім участку 120 кватэрў, у сярэднім па тры-чатыры чалавекі.

...У XVIII стагоддзі графіня Радзівіл увяла беларускую мову за паўмесяца. У 1953 годзе па распараджэнні Савета Міністраў СССР усе раённыя, абласныя, краявыя і рэспубліканскія, партыйныя і савецкія ўстановы павінны былі перайсці на мясцовую мову цягам месяца. У Беларусі было вялікае перавыкананне. Магілёўскі абкам партыі, напрыклад, перайшоў за тры тыдні.

У 90-я гады таго стагоддзя за нейкія год-два 80—90 % нашых школ сталі беларускамоўнымі. У райвыканкамах з'явіліся перакладчыкі на беларускую мову, але неўзабаве яны сталі непатрэбныя. Павялічвалі заробкі беларускамоўным выкладчыкам і настаўнікам. Насельніцтва дзяржавы адразу загаварыла па-беларуску.

Сёлетні перапіс мне яскрава паказаў веліч і дабрыню майго беларускага народа. Яны любяць беларускасць, хочуць вучыць такой любові дзяцей. Трэба іх не асаджваць, а дапамагаць ім у гэтым. Чакаюць зрухаў на дзяржаўным узроўні.

Не наракайце на народ беларускі, ён працуе як можа, жыве як атрымліваецца, спрабуе рабіць усё для лепшай будучыні сям'і, нацыі, дзяржавы.

Лічу, народ у нас інэртны, яго цяжка разагнаць, затое калі разгоніцца — ужо не спыніш.

**Юльян МІСЮКЕВІЧ, студэнт БДУ, перапісчык па вул. Матусевіча, г. Мінск.**

*22 кастрычніка 2009 г.*

## У ПЕНСІЯНЕРКІ ЖЫВУЦЬ 117 КОШАК

У Маскве жыльцы дома ў Шыпілаўскім праездзе больш за 10 гадоў спрабуюць выселіць суседку з яе 117 кошкамі, аднак пакуль ім гэта не ўдаецца.

Жыхарка аднапакаёвай кватэры, адзінокая пенсіянерка Святлана Фралова ўпершыню стала браць бяздомных жывёл да сябе дамоў 12 гадоў таму. Жыхары пад'езда напісалі калектыўную скаргу. Калі жанчыну ўдалося ўгаварыць адчыніць дзверы, у кватэры налічылі каля 60 кошак і сабак. Усю жыўнасць адправілі ў прытулкі. Першы бой жыхары выйгралі. Аднак пенсіянерка ўзялася за старое. Яна за кароткі час сабрала новую армію бяздомных жывёл, цяпер жанчына дзеліць кватэру са 117 кошкамі. Гэта рэкорд.

**БЕЛТА.**

## БЯСПЛАТНЫЯ БІЛЕТЫ НА ДЗІЦЯЧАЕ «ЕЎРАБАЧАННЕ-2009» — З 1 ЛІСТАПАДА

**Замовіць бясплатныя білеты на дзіцячае «Еўрабачанне-2009» змогуць усе ахвотныя з 1 лістапада. Пра гэта паведамілі на прэс-канферэнцыі ў Кіеве арганізатары дзіцячага песеннага конкурсу.**

Сёлетні дзіцячы конкурс «Еўрабачанне» з'яўляецца некамерцыйным праектам. Менавіта таму білеты на рэпетыцыю і фінальны канцэрт конкурсу будуць распаўсюджвацца бясплатна па папярэдняй замове на афіцыйным сайце Нацыянальнай тэлекампаніі Украіны. Вызначаная колькасць бясплатных запрашэнняў будзе распаўсюджаная сярод выхаванцаў дзіцячых дамоў, школ-інтэрнатаў Украіны. Зала кіеўскага Палаца спорту, на сцэне якой будзе праходзіць «Еўрабачанне», разлічаная на 6,5 тыс. чалавек.

**БЕЛТА.**



### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ В г. БРЕСТЕ

| Адрес участка/ кадастровый номер | ул. Немцевича, 65 № 140100000001024147 | ул. Немцевича, 70 № 140100000001024149 | ул. Немцевича, 72 № 140100000001024150 | ул. Немцевича, 74 № 140100000001024151 |
|---|---|---|---|---|
| № лота | 1 | 2 | 3 | 4 |
| Начальная цена продажи (руб.) | 9 747 030 | 9 747 030 | 9 754 780 | 9 754 780 |
| Сумма задатка (руб.) | 970 000 | 970 000 | 970 000 | 970 000 |
| Расх. по подг. земел.- кадастр. док. (руб.) | 497 133 | 497 133 | 497 133 | 497 133 |
| Общая площадь (га) | 0,1257 | 0,1257 | 0,1258 | 0,1258 |
| Целевое назначение | для строительства и обслуживания жилого дома | | | |
| Характеристика ограничений в использовании земли | водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос на площади 0,1257 га | водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос на площади 0,1257 га | водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос на площади 0,1258 га | водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос на площади 0,1258 га |
| Адрес участка/ кадастровый номер | ул. Немцевича, 76 № 140100000001024152 | ул. Немцевича, 78 № 140100000001024153 | ул. Немцевича, 80 № 140100000001024155 | ул.Целинная, 32/1 № 140100000001024164 |
| № лота | 5 | 6 | 7 | 8 |
| Начальная цена продажи (руб.) | 9 754 780 | 9 754 780 | 9 754 780 | 29 872 460 |
| Сумма задатка (руб.) | 970 000 | 970 000 | 970 000 | 2 980 000 |
| Расх. по подг. земел.- кадастр. док. (руб.) | 497 133 | 497 133 | 497 133 | 551 819 |
| Общая площадь (га) | 0,1258 | 0,1258 | 0,1258 | 0,0731 |
| Целевое назначение | для строительства и обслуживания жилого дома | | | |
| Характеристика ограничений в использовании земли | водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос на площади 0,1258 га | водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос на площади 0,1258 га | водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос на площади 0,1258 га | ограничений в использовании земель нет |
| Условия продажи | ● осуществить в двухмесячный срок после принятия решения Брестского городского исполнительного комитета о предоставлении земельного участка, государственную регистрацию права на него; ● приступить к освоению земельного участка в течение 1 года со дня получения свидетельства о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка) | | | |

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**

**Перечень документов представляемый потенциальным участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; заверенную копию платежного поручения о внесении задатка; **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность. При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. **Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Задаток в размере до 10 % от начальной цены объекта перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012000002678 в филиале № 126 АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код 252, УНП 290433924. Лицо, желающее участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносит задаток в размере, установленном для объекта с наибольшей начальной ценой.

**Примечания: Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.** Для проведения аукциона необходимо наличие не менее 2-х участников.

В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Победитель аукциона обязан:** ● в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка осуществить оплату за аукционный объект и возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации; ● приступить к освоению земельного участка в течение 1 года со дня получения свидетельства о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка); ● осуществить в 2-месячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию права на земельный участок. **Победитель аукциона обязан** в течение 10 рабочих дней с даты принятия решения о предоставлении земельного участка возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

**Аукцион состоится 25 ноября 2009 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605. Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 23.10.2009 г. до 17.30 20.11.2009 г. по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46. Контактные телефоны: 23 81 92, 23 45 56, 23 43 48. Сайт:bgcn.by, city.brest.by**

### Извещение об открытом повторном аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно

| № лота | наименование объекта | местонахождение объекта | площадь земельного участка (га) | кадастровый номер | начальная цена продажи (руб.) | сумма задатка (руб.) | сумма возмещения расходов, связанная с проведением аукциона (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Земельный участок У-874 | м-н «Зарица-3» | 0,1017 | 440100000003004134 | 13 700 000 | 1 370 000 | 2 999 094 |
| 2. | Земельный участок У-875 | м-н «Зарица-3» | 0,1377 | 440100000003004133 | 18 500 000 | 1 850 000 | 3 153 505 |
| 3. | Земельный участок У-1007 | м-н «Зарица-3» | 0,0985 | 440100000003004114 | 13 300 000 | 1 330 000 | 2 671 375 |
| 4. | Земельный участок У-69К | м-н «Южный-4» | 0,1140 | 440100000003004036 | 22 000 000 | 2 200 000 | 2 733 118 |
| 5. | Земельный участок У-83К | м-н «Южный-4» | 0,1084 | 440100000003004066 | 20 900 000 | 2 090 000 | 2 733 118 |
| 6. | Земельный участок 277 | м-н «Погораны-Кошевники» | 0,1148 | 440100000003004237 | 16 000 000 | 1 600 000 | 2 479 747 |
| 7. | Земельный участок 315 | м-н «Погораны-Кошевники» | 0,1176 | 440100000003004242 | 16 000 000 | 1 600 000 | 2 374 471 |

**Аукцион состоится 17 ноября 2009 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2.** Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57, в рабочие дни с 8.30 до 17.30 с 26 октября по 11 ноября 2009 г. Телефон для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: **www.gorod.grodno.by.** Подробные извещения опубликованы в газете «Звязда» № 174 (26532) от 16.06.2009 г. и газете «Гродненская правда» № 110 (15473) от 17.10.2009 г.



Спорт-тайм

## ЧОРНЫ ДЗЕНЬ ІСПАНСКІХ ГРАНДАЎ

У сераду матчамі ў групах A, B, C і D завяршыўся трэці раўнд групавога турніру Лігі чэмпіёнаў. Гэты тур стаў сапраўдным «чорным днём» для іспанскіх грандаў. Услед за «Барселонай» хатняе паражэнне пацярпеў і самы тытулаваны клуб свету — мадрыдскі «Рэал». Нягледзячы на перавагу ў першым тайме і лепшыя статыстычныя паказчыкі, перамогу святкаваў «Мілан» (3:2). З-за гэтага паражэння мадрыдцы саступілі першае месца ў **групе C** «Мілану». «Цюрых» (Швейцарыя) саступіў «Марсэлю» (Францыя) — 0:1. **Турнірнае становішча** ў групе C: «Мілан» — 6 ачкоў, «Рэал» — 6, «Марсэль» — 3, «Цюрых» — 3.

Вось астатнія вынікі матчаў: г**рупа A:** «Бардо» (Францыя) — «Баварыя» (Германія) — 2:1, «Ювентус» (Італія) — «Макабі» (Ізраіль) — 1:0; **група B:** ЦСКА (Расія) — «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія) — 0:1, «Вольфсбург» (Германія) — «Бешыкташ» (Турцыя) — 0:0. **Турнірнае становішча:** «Манчэстэр Юнайтэд» — 9 ачкоў, «Вольфсбург» — 4, ЦСКА — 3, «Бешыкташ» — 1. **Група D:** «Чэлсі» (Англія) — «Атлетыка» (Іспанія) — 4:0, «Порту» (Партугалія) — АПОЭЛ (Кіпр) — 2:1. **Турнірнае становішча:** «Чэлсі» — 9 ачкоў, «Порту» — 6, АПОЭЛ — 1, «Атлетыка» — 1.

Матчы 3-га тура яшчэ ў чатырох групах адбыліся 20 кастрычніка. **Група E:** «Дэбрэцэн» (Венгрыя) — «Фіярэнціна» (Італія) — 3:4, «Ліверпуль (Англія) — «Ліён» (Францыя) — 1:2. **Турнірнае становішча:** «Ліён» — 9 ачкоў, «Фіярэнціна» — 6, «Ліверпуль» — 3, «Дэбрэцэн» — 0. **Група F:** «Барселона» (Іспанія) — «Рубін» (Расія) — 1:2, «Інтэр» (Італія) — «Дынама» (Украіна) —2:2. **Турнірнае становішча:** «Барселона» — 4 ачкі, «Дынама» — 4, «Рубін» — 4, «Інтэр» —3. **Група G:** «Рэйнджэрс» (Шатландыя) — «Уніра» (Румынія) — 1:4, «Штутгарт» (Германія) — «Севілья» (Іспанія) — 1:3. Беларускі паўабаронца «Штутгарта» Аляксандр Глеб быў заменены на 69-й хвіліне. **Турнірнае становішча:** «Севілья» — 9 ачкоў, «Уніра» — 4, «Штутгарт» — 2, «Рэйнджэрс» — 1. **Група H:** АЗ (Галандыя) — «Арсенал» (Англія) — 1:1, «Алімпіякас» (Грэцыя) — «Стандарт» (Бельгія) — 2:1. **Турнірнае становішча** «Арсенал» — 7 ачкоў, «Алімпіякас» — 6, АЗ — 2, «Стандарт» — 1. Матчы 4-га тура групавой стадыі Лігі чэмпіёнаў пройдуць 3—4 лістапада.

## ХЭНЛАН ЗАСТАЕЦЦА СА ЗБОРНАЙ

Глен Хэнлан працягне кіраваць нацыянальнай зборнай па хакеі. Дамоўленасць аб гэтым дасягнутая 22 кастрычніка на сустрэчы 52-гадовага канадскага спецыяліста са старшынёй федэрацыі хакея Уладзімірам Навумавым. «Некалькі гадоў таму мы пачалі доўгі шлях да вяршыняў, і было б няправільна цяпер усё пакінуць. Я з задавальненнем буду рыхтаваць каманду да Алімпіяды і чэмпіянату свету», — цытуе Хэнлана прэс-служба ФХРБ. Трэнер пакуль не вызначыўся, дзе будзе жыць — у Беларусі ці ў Канадзе.



### СВЕДЕНИЯ ОБ ОБЪЕКТАХ РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, ПОДЛЕЖАЩИХ РАЗГОСУДАРСТВЛЕНИЮ И ПРИВАТИЗАЦИИ

| Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность | Республиканское производственно-сервисное унитарное предприятие «БЕЛАЗ – СЕРВИС» (РПСУП «БЕЛАЗ – СЕРВИС»), Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Пружанский завод радиодеталей» (РУП «Пружанский завод радиодеталей»), Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Жлобинская швейная фабрика» (РУП «Жлобинская швейная фабрика»), Белорусский государственный концерн по производству и реализации товаров легкой промышленности | Республиканское торгово-производственное унитарное предприятие «Гомельхимторг» (РУП «Гомельхимторг»), Министерство торговли Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Завод железобетонных изделий» (РУП «Завод ЖБИ»), Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|
| Адрес | 222160, Минская область, г. Жодино, ул. 40 лет Октября, 15 | 225133, Брестская область, г. Пружаны, ул. Красноармейская, 81 | 247210, Гомельская область, г. Жлобин, ул. Петровского, 17 | 247760, г. Гомель, ул. Могилевская, 20 | 247672, Гомельская область, г. Рогачев, ул. Белинская, 560 |
| Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции | Производство пластмассовых изделий, используемых в строительстве; ремонт прочих машин специального назначения; перевозка грузовым автомобильным транспортом | Производство автомобильного, тракторного, мотоциклетного электрооборудования | Производство верхней одежды, спецодежды, изделий из натурального и искусственного меха | Оптовая торговля химическими веществами, химическими продуктами, лакокрасочными материалами, чугуном, сталью и их литьем, трубами; производство красок, лаков эмалей, минеральных пигментов для них | Производство сборных железобетонных и бетонных конструкций и изделий |
| Положение на рынке | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение |
| Планируемые сроки разгосударствления и приватизации | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. |
| Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение | Минский областной территориальный фонд государственного имущества, 220039, г. Минск, ул. Чкалова, 5 | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества, 220071, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Гомельский областной территориальный фонд государственного имущества, 246050, г. Гомель, пр. Ленина, 3 | Гомельский областной территориальный фонд государственного имущества, 246050, г. Гомель, пр. Ленина, 3 | Гомельский областной территориальный фонд государственного имущества, 246050, г. Гомель, пр. Ленина, 3 |
| Численность работающих, чел. | 43 | 265 | 375 | 249 | 177 |
| Срок предъявлений претензий | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО, руб. | 3 738 574 400 | 9 676 902 400 | 3 824 959 600 | 16 302 638 000 | 16 527 046 800 |
| Стоимость основных фондов – всего, руб. | 1 687 388 004 | 9 920 612 794 | 5 577 852 605 | 14 671 405 890 | 9 855 615 015 |
| Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га | 1,2297 | 7,40 | 1,1699 | 25,87 | 11,7128 |
| Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, руб. | 449 571 322 | нет | 4 175 450 | нет | 22 721 963 |
| Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, руб. | нет | нет | нет | нет | нет |
| Финансовое состояние объекта, руб.: Балансовая прибыль | 272 443 792 | 209 504 902 | 151 522 144 | 2 801 997 971 | 427 626 762 |
| Финансовое состояние объекта, руб.: Задолженность кредиторская | 2 780 031 659 | 1 787 690 306 | 834 721 621 | 7 810 972 911 | 1 322 652 227 |
| Финансовое состояние объекта, руб.: Задолженность дебиторская | 1 362 814 100 | 974 927 193 | 240 384 140 | 1 473 545 423 | 546 983 296 |

УНП 100745627.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.52 | 17.54 | 10.02 |
| Віцебск — | 7.45 | 17.41 | 9.56 |
| Магілёў — | 7.42 | 17.44 | 10.02 |
| Гомель — | 7.36 | 17.44 | 10.08 |
| Гродна — | 8.07 | 18.10 | 10.03 |
| Брэст — | 8.04 | 18.14 | 10.10 |

**Месяц**

***Першая квадра 26 кастрычніка. Месяц у сузор'і Казярога.***

**Імяніны**

**Пр.** *Андрэя, Інакенція.*

**К.** *Іветы, Марлены, Тэклі, Ігната, Северына, Тодара, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## Дзве даты

### 23 кастрычніка

**1924 год** — у Мінску пачаліся рэгулярныя аўтобусныя перавозкі пасажыраў. На лінію выйшлі 15 машын англійскай фірмы «Лейланд», кожная з якіх перавозіла 30 чалавек. Хуткасць аўтобусаў на маршрутах дасягала 30 вёрст у гадзіну (на многіх вуліцах сталіцы гэтаму сёння па-добраму пазайздросцілі б).



**1917 год** — Ленін, які нечакана з'явіўся на пасяджэнні ЦК РСДРП (б), пераламаў ход дыскусіі і настаяў на прыняцці рэзалюцыі аб неабходнасці ўзброенага паўстання.

## Цытата дня:

***«Цвёрды характар павінен спалучацца з гібкасцю розуму».***

**Люк дэ Вавенарг (1715—1747), французскі пісьменнік.**

# СІМВАЛІЗАЦЫЯ ДАРОГІ

Свет і сусвет чалавека

**Дарога ў культуры ўсходніх славян была надзелена мноствам рытуальных і сакральных функцый. Яна заўсёды суадносілася з жыццёвым шляхам, таму нашы продкі казалі, што ў кожнага з нас «свая» дарога, хоць, уласна кажучы, кожнаму з нас наканавана прайсці адну дарогу — ад роднай калыскі ці роднага парога і да могілак, або ад покуці роднай хаты і да храма (зямнога ці нябеснага). Дарога была сувязным шляхам паміж светам жывых і «светам» продкаў. Аб паміраючым чалавеку казалі, што ён стаіць на «смяротнай» дарозе і забаранялі спачуваць яму слязьмі і енкамі, каб ён не «сышоў з дарогі».**

● Дарога стала тым месцам, дзе найбольш выразна праяўляецца лёс чалавека, яго доля, поспех, шчасце.

● Поспех у дарозе прадказвала сустрэча з каровай, сабакам, ваўком, чалавекам, які нясе поўныя вёдры вады, бяздольным чалавекам. Няўдалай будзе дарога пры сустрэчы са святаром, з цяжарнай ці жанчынай, якая не так даўно нарадзіла, з чалавекам, які ідзе з пустымі вёдрамі, пахавальнай працэсіяй, а таксама кошкай, зайцам, змяёй.

● Сустрэча вясельнага картэжу і пахавальнай працэсіі была вельмі непажаданай — яна прадказвала магчымую смерць або недаўгавечнасць першынца ў маладой сям'і.

● Дарога — гэта месца, дзе «жывуць» міфалагічныя персанажы, якія ці палохаюць вандроўніка, ці наадварот, дапамагаюць яму не збочыць з дарогі або адшукаць шлях дадому: лесуны, сустрэчнікі, дарожныя цар і царыца, блукаючыя агеньчыкі, «дарожны страх», чэрці. У выглядзе вандроўніка ці згубленай жывёліны (пеўня, кабана, барана) яны сядаюць на калёсы, і тады чалавек знікае ў царстве смерці назаўсёды.

● У такіх выпадках сачылі за паводзінамі каня. Калі пры сустрэчы з чалавекам ці жывёлай конь паводзіў сябе спакойна, значыць, можна не хвалявацца, калі ж конь станавіўся, быццам укапаны, — чакай бяды. Лічылася вельмі дрэннай прыкметай, калі перад адпраўленнем у дарогу конь пачынаў біць зямлю капытом.

● Асаблівым аб'ектам увагі ў народнай культуры стала скрыжаванне дарог, разнастайныя месцы іх разгалінавання, перасячэння дарог і варотаў, мяжы вёскі, маста і іншых перашкод.

● Народная традыцыя па-рознаму ставілася да кожнага дня тыдня. Лічылася, што найбольш спрыяльнымі для адпраўлення ў далёкую дарогу з'яўляюцца аўторак і чацвер; асабліва няўдалым — панядзелак.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся!

**Спадарыня Андэрсан падала заяву аб разводзе, якую яна матывуе тым, што муж нават не папрасіў прабачэння ў яе пасля таго, як выйшаў выпіць піва ў 1985 годзе, а вярнуўся ў 2000-м.**

☺

Расследуюць гібель цэлай вёскі. Распытваюць дзеда, які адзін застаўся жывы.

— Як гэта ўсё здарылася?

— Быў у нас адзін аматар-грыбнік, назбіраў грыбоў і атруціўся.

— А астатнія?

— Астатнія — у яго на памінках.

☺

**Адкрыты космас, на арбіце касмічная станцыя. Каля люка, прышпіліўшыся на тросе, вісіць касманаўт і барабаніць у сценку рукамі і нагамі з ровам: «Адкрывай! Што за звычка пытацца: «Хто там?!!»**

☺

— Я ў дзесяць гадоў пагуляў у індзейцаў — зрабіў добры лук з арэшыны і.. засадзіў дзеду паміж лапатак добра завостранай стралой.

— Рукі-ногі дзед не адарваў?

— Не, але ў той дзень я даведаўся, што стары дзед можа хутка бегчы тры кіламетры без прыпынку і пры гэтым не перастаючы хвастаць мяне галінкай вярбы...

☺

**Абвестка.**

**Спрактыкаваны вядзьмар. Выганяю д'яблаў і неспрактыкаваных ведзьмароў.**




# ЖУРАВІНАВАЯ РЭСПУБЛІКА

**Добры ўраджай журавін сёлета сабралі гаспадары з пасёлка Ганчанскі Клічаўскага раёна. Плантацыі буйнаплодных журавін, закладзеныя вяскоўцамі прама ў лесе на пачатку крызісных 1990-х гадоў, цяпер даюць магчымасць дадатковага заробку.**

— Сёлета я ўжо 800 кілаграмаў сабраў са сваёй падсобнай гаспадаркі ў 30 сотак, — паказвае на мех з ярка-чырвонымі журавінамі **Аляксей НЕСЦЯРЭНКА**. — І яшчэ будзе. Праўда, пасля замаразкаў ягада стане іншая: мяккая, больш сакавітая, смачная. Збіраць яе будзе больш складана, аднак справімся.

Калісьці Аляксей Аляксеевіч разам з сябрамі папрасілі ў мясцовага торфапрадпрыемства выдзеліць ім адпрацаваныя ўчасткі зямлі для эксперыменту. Энтузіясты ягаднай справы з'ездзілі ў Ганцавічы, за складзеныя грошы набылі парасткі буйнаплодных журавін амерыканскага гатунку, высадзілі на лясных пляцоўках з канавамі для вады і сталі чакаць ураджаю. Давялося чакаць доўга: толькі ў апошнія пяць гадоў «амерыканка» стала даваць на клічаўскай зямлі прыстойны ўраджай.

**— Пасадзілі журавіны ў першы крызіс, а прыбытак ад тых выдаткаў атрымалі ў другі!** — смяюцца ўдзельнікі таварыства ўласнікаў журавінавых плантацый.

Дарэчы, яны лічаць сваё таварыства адкрытым, і прапануюць парасткі буйных журавін усім ахвотным у пасёлку. Месца на балоце ўсім хопіць. Праўда, папярэджваюць спрактыкаваныя плантатары, тут патрабуюцца цярплівасць і ўпартасць.

Працы шмат: на зборы ўраджаю цяпер працуюць дацямна не толькі 12 сем'яў, якія ўваходзяць у склад таварыства, але і ўсе іх сваякі і сябры. «Гэта пякельная праца, бо грабём ручкамі», — кажуць людзі.

Аляксей Несцярэнка — школьны настаўнік музыкі, яго жонка выкладае мову і літаратуру. Аднак яны не бачаць ніякага супярэчання ў тым, што ў вольны ад настаўніцтва час займаюцца журавінамі.

— Гэта і задавальненне, і пэўны заробак, — кажа Аляксей Аляксеевіч. — Натуральна, што мы імкнёмся зарабіць. У мяне няма гаспадаркі і жывёлы, а ёсць толькі школа і журавінавая плантацыя.

Журавіны з Ганчанскага адрозніваюцца ад дзікіх, якія растуць на балоце. Гэта буйныя ягады, мясістыя, не вельмі кіслага смаку. «Амерыканку», калі шчыра, не вельмі любяць перапрацоўчыя прадпрыемствы: кажуць, што яна не вельмі прыдатная для вырабу віна. Затое джэмы і кампоты з буйнаплодных журавін атрымліваюцца выдатныя. Хатнія гаспадыні з задавальненнем купляюць прыватным чынам ягады з ганчанскіх плантацый: сёлета тут просяць **5 тысяч рублёў за кілаграм**.

Але і сабраныя на балоце, і вырашчаныя на плантацыях журавіны аднолькава карысныя для здароўя.

— Як можна не любіць журавіны? — здзіўляецца Аляксей Несцярэнка. — **Гэта самыя лепшыя лекі — ад ціску, ад грыпу і прастуды.** Журавіны з мёдам, у кампоце ці морсе — смачна і карысна. Я аддаю перавагу тоўчаным журавінам з цукрам. Ягады трэба прапусціць праз звычайную мясарубку або размяць таўкачыкам і дадаць цукру, каб атрымалася 50 на 50. Атрымліваецца ярка-ружовая сумесь: адна лыжка на дзень дадасць здароўя.



**Настаўнік музыкі і журавінавы плантатар з Ганчанскага Аляксей НЕСЦЯРЭНКА.**

Можна рабіць і журавінавае варэнне. Праўда, тут давядзецца пазбаўляцца скурак. Ягадам трэба зрабіць першую прыпарку, каб яны далі сок, а потым мякаць працерці праз марлю альбо друшляк. Дадаць цукар — і лепей не прыдумаць!

А яшчэ Несцярэнкі робяць **журавінавы квас**. У бочку трэба наліць чыстай і, лепей за ўсё, крынічнай вады. Чыстыя журавіны (цісніць іх не трэба) дабаўляюцца ў разліку: адно вядро на 30 літраў вады. Потым цукар, каб вада стала крыху салодкай.

— Зачыняй і чакай! — завяршае рэцэпт Аляксей Аляксеевіч. — Настойваць трэба тыдзень альбо два. Калі вада стала ружовай, можна піць. Час ад часу трэба дадаваць ваду зноў, да поўнага, так бы мовіць, зносу ягады. У нас журавінавы квас выдыхаецца толькі вясной.

Аднак усё гэта журавінавыя прысмакі ўласнай вытворчасці, а ганчанскія плантатары мараць пра шырокую прамысловую перапрацоўку іх прадукту, і не толькі іх.

— Наша **Клічаўшчына — ягадная рэспубліка**, — лічаць у Ганчанскім. — Тут шмат не толькі журавін, але і чарніц, і грыбоў. Таму хацелася б мець у нашым раёне перапрацоўчы камбінат. Каб на месцы не толькі марозіць ягады, але і рабіць сокі, джэмы і розныя папулярныя прысмакі. Напрыклад, журавіны ў цукры альбо ў цукровай пудры. Вось гэта быў бы высокі ўзровень!

Калі ёсць гарантыя збыту прадукцыі, то можна і пашыраць справу. Яшчэ некалькі гадоў таму нарадзілася ідэя пасадзіць на лясных плантацыях буякі.

— **Канадскія буякі** — гэта буйныя ягады, дыетычныя, — расказвае плантатар. — Куст дасягае двух метраў у вышыню, а ягады памерам з пазногаць. Захоўваюцца яны больш працяглы час, чым чарніцы. Мы робім з буякоў варэнне.

Але вырошчваць гэтыя ягады на ганчанскіх плантацыях нялёгка: трэба агароджваць пляцоўкі ад лясных жывёл, і да таго ж выспяваюць буякі ўлетку, калі камары ды аваднi з вялікім задавальненнем «паядуць» зборшчыкаў ураджаю... Таму канадскія буякі пакуль растуць толькі на агародзе Несцярэнкаў. У лесе ім хапае пакуль журавін.

— Як вам падаецца, ваш занятак — гэта наватарства ў жыцці беларускай глыбінкі альбо вяртанне да каранёў? — пытаюся на заканчэнне ў Аляксея Несцярэнкі.

— Гэта цікавасць да жыцця. На нашых балотах растуць журавіны, і яны для нас добры заробак. На гэтым і стаім: на выжыванні і інтарэсе.

**Ілона ІВАНОВА.**
*Клічаўскі раён.*

## УСЕ ЖУРАВІНЫ

*набудзе ў насельніцтва Магілёўскі аблспажыўсаюз. У гэтым запэўніў* ***начальнік упраўлення нарыхтовак Аляксандр УТКІН***

Пакуль кампанія нарыхтовак журавін у Магілёўскай вобласці ідзе не самымі шпаркімі тэмпамі — сабрана каля сотні тон, хоць толькі на экспарт аблспажыўсаюз можа накіраваць замарожаных журавін у 10 разоў болей.

Тлумачыцца гэта ўмовамі надвор'я — у балотах стаіць вада, а яшчэ болей — сціплымі цэнамі на журавіны.

— Сёлета мы плацім за журавіны 2300—2400 рублёў за кілаграм, — расказаў Аляксандр Мікалаевіч. — Летась было болей: 3500—4000. Але сусветны рынак дыктуе свае ўмовы.

Посткрызісныя цэны не вельмі падабаюцца насельніцтву, якое, відаць, прытрымлівае ягаду да лепшых часін. Тым больш, што ў раёнах, якія пацярпелі ад чарнобыльскай радыяцыі, журавіны купляюць толькі на прамысловую перапрацоўку для вырабу віна яшчэ танней — 2000—2300 рублёў за кілаграм.

— На экспарт ідзе ўся ягада толькі з Асіповічаў, Глуска і Бабруйска, — патлумачылі ва ўпраўленні нарыхтовак. — Што датычыцца Клічаўскага раёна, то там узнікаюць праблемы па радыяцыі на палове тэрыторыі. Норма ўтрымання радыенуклідаў для экспарту журавін, а таксама вырабу з іх джэмаў і сокаў, напалову меншая за перапрацоўку на віно. Але мы набудзем у людзей усе журавіны, якія ёсць! Усе крамы і нарыхтоўчыя пункты аблспажыўсаюза працуюць без выхадных, на месцы і без затрымак выдаюць грошы!

# ХТО ПАКРЫЎДЗІЎ ПАЛЕШУКОЎ?



**Што сёлета людзі не атрымалі ад журавін таго прыбытку, на які спадзяваліся, добра вядома, але ж у «пралёце» апынуліся і тыя, хто ў папярэднія гады ягаду закупляў па высокай цане ці вырошчваў яе сам.**

У Ганцавіцкім раёне дзве арганізацыі звязаныя з дзікарослымі ягадамі — гэта спажыўтаварыства і «Журавінка» — навукова-даследчая лабараторыя Акадэміі навук Беларусі. Калі райпа займаецца толькі закупкай ягад ад насельніцтва, то «Журавінка» вырошчвае іх.

Падчас майго прыезду Ганцавіцкае райпа адзначала сваё 70-годдзе, а гэта прымусіла зрабіць акцэнты на некаторыя моманты з жыцця гэтай структуры ў апошнія гады.

Сёння Ганцавіцкае спажыўтаварыства знаходзіцца на 13-м месцы са 118 райпа краіны, а тры гады таму было на перадапошнім.

Арганізацыя не магла звесці канцы з канцамі. Усё было пушчана на самацёк. Такая бескантрольнасць прывяла да таго, што цэлая група бухгалтараў і работнікаў крамаў апынулася на лаве падсудных.

А калі райпа ўзначаліў новы старшыня Аляксандр Селюжыцкі, то пачаўся пад'ём. У 2006 годзе райпа атрымала першы прыбытак, а ўжо на наступны год у раёне адчынілі 7 новых міні-крамаў, дзве кавярні ў аграгарадках, увялі самаабслугоўванне. У арганізацыі павысілася дысцыпліна, хоць Аляксандр Уладзіміравіч хацеў бы яшчэ многіх работнікаў замяніць, але кадравы голад не дае магчымасці гэта зрабіць.

А зараз вернемся да дзікарослых ягад, якіх было закуплена летась 47 % ад агульнага аб'ёму нарыхтовак, а сёлета — толькі 33 працэнты, хоць сезон яшчэ і не закончыўся.

Апошнія гады закупачная цана на журавіны пастаянна расла, і насельніцтва да гэтага так прывыкла, што, калі сёлета цана рэзка ўпала, людзі пачалі абурацца і бачыць нейкую змову. Маўляў, нарыхтоўшчыкі згаварыліся і вызначылі такую нізкую цану на журавіны. Але ж яшчэ ў 2006 годзе журавіны закупляліся па 1700—2200 руб./кг, у 2007-м — па 3000—6500 руб./кг, у 2008-м — па 3000—5500 руб./кг, а сёлета — па 1800—2200 руб./кг. Як бачым, цана вярнулася на кругі свае — у 2006 год, калі насельніцтва іншага кошту ягады не ведала і здавала журавіны актыўна.

Ганцавіцкае райпа сёлета набыло 48 тон журавін і цяпер прадае іх на рынках краіны, бо прадпрыемствам журавіны не патрэбныя, як ніхто не цікавіцца імі і за мяжой. Расія адмовілася, абыякавыя да журавін у Польшчы і Літве. Раней палякі і літоўцы самі прыязджалі, а сёлета — ніхто. На рынках райпа прадае журавіны па цане 3160—3600 руб./кг, а калі паднялі кошт ягады да 3900 руб./кг, то гандаль не пайшоў. У такой сітуацыі людзі вырашылі самі прадаваць балотныя ягады, і на рынках у Баранавічах журавін хапае. За 10-літровае вядро просяць 35 тысяч, а гэта прыкладна 3500 руб./кг — больш, чым прапаноўваюць нарыхтоўшчыкі, але і збыць тыя журавіны на рынку не проста. Праблему можа вырашыць толькі аптовы пакупнік.

Больш сур'ёзная сітуацыя склалася ў «Журавінцы». Калі спажыўтаварыства можа ягады і не закупляць, то на «Журавінцы» яе вырошчваюць і некуды павінны збыць.

Тут, каб журавіны не былі стратнымі, неабходна прадаваць іх па 4 тысячы за кілаграм, але ж па такой цане іх ніхто не купіць.

— Знізім кошт і прададзім іх са стратамі, але гэта будзе найлепшае выйсце. Не прападаць жа журавінам, — адзначыў загадчык лабараторыі Мікалай Паўлоўскі. — Мы не можам канкурыраваць з тымі, хто збірае ягады на балоце. Цяжка, але ж і бясплатна. А ў нас вялікія затраты на плантацыях.

У Латвіі праходзіла Міжнародная навуковая канферэнцыя па брусьнічных культурах, удзельнікам якой быў М. Паўлоўскі. І вось што ён сказаў: «Там іншыя тэхналогіі. Калі чалавек выпрацаваў тарфянікі, то там і пасадзіў журавіны, а калі сабраў ураджай, то не прадае ягады, а сам перапрацоўвае іх. У нас такое не практыкуецца, хоць прыбытак ад латвійскіх напрацовак значна большы».

Са збытам журавін сёлета ўзнікла праблема, а вось чарніцы, як і летась, карысталіся попытам. Сёлета Ганцавіцкае спажыўтаварыства закупіла ў насельніцтва 180 тон гэтай ягады, якая пайшла на экспарт. На 100 тонах рэалізаваных чарніц зарабілі 120 млн прыбытку. Гэтую ягаду з задавальненнем закуплялі фірмы Польшчы і Літвы.

Цэны на журавіны ў мінулыя два гады выраслі дзякуючы попыту на іх за мяжой. А калі не адпраўляць ягады на экспарт, то цана будзе значна ніжэйшай. На складзе райпа заставалася каля 40 тон журавін з мінулага года, якія з цяжкасцю ўдалася збыць харчоваму камбінату на перапрацоўку.

У 2008 годзе з 200 тон набытых у насельніцтва журавін 60 тон пайшлі на экспарт, а сёлета за мяжу не адправілі ні адной тоны. Зразумела, што ніхто такую колькасць журавін закупляць сёлета не будзе, нават па самай нізкай цане. Людзі ўсё ж ягады збіраюць, але збываць іх не спяшаюцца. А раптам цана на журавіны падымецца!



Трэба зразумець, што мы ўжо даўно знаходзімся ў рынку і можна наракаць толькі на яго. Вось на бульбу цана сёлета рэзка падскочыла, бо ў многіх месцах «другі хлеб» не ўрадзіў і нехта апынуўся ў выйгрышы. Каб жа ўсё ўдавалася прадбачыць...

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**
*Ганцавіцкі раён.*

## За зачыненымі дзвярыма

# Гэты стогн у нас сэксам завецца!

## Сэксуальныя расстройствы немагчыма лячыць у адзіночку

Замежная практыка аказання дапамогі інтымнага характару мае на мэце работу з парай. Робіцца гэта прыблізна так. Спачатку пацыента-мужчыну абследуе сэксолаг-мужчына, партнёршу — сэксолаг-жанчына. (Дарэчы, дзясятак сэксолагаў у нашай краіне складаецца з мужчын). Потым спецыялісты мяняюцца пацыентамі. Далей абменьваюцца заключэннямі, уласным бачаннем сітуацыі і... выносяць вердыкт. Так бы мовіць, становячы прадугледжвае далейшае спалучэнне тэорыі з практыкай. Пару могуць нават пасяліць тыдні на два ў якой-небудзь глушы, дзе нованароджаныя Адам і Ева разняволяцца і... як след адпрацуюць тэарэтычны матэрыял. Не апасаючыся таго, што суседзі пачуюць эратычныя стогны...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Аднак вердыкт сэксолагаў можа навесці партнёраў і на вялікі роздум... Грошы за кансультацыю, а некалі гаворка ішла дзесьці пра пару тысяч долараў, пацыентам маглі вярнуць. Тым самым сэксолагі прызнавалі, што не ў сілах устанавіць гармонію паміж гэтымі асобамі. Прычына? Ну, скажам, у аднаго з партнёраў ёсць устаноўка на паляпшэнне сітуацыі, а ў другога няма. Сэкс жа, як вядома, — «катанне» парнае. «А мы раптам спадзяёмся на вынік, працуючы з адным партнёрам...», — кажа **урач-сэксолаг Мінскай вобласці Дзмітрый КАПУСЦІН**. На яго думку, гарманічныя адносіны ў шлюбе наогул у многім абумоўлены матывацыяй заключэння гэтага саюза. Навошта я выходжу замуж ці жанюся?..

Вось рэальная гісторыя: жанчына пражыла ў шлюбе шэсць гадоў, зацяжарала і... вырашала разысціся з мужам. Сэксолагу патлумачыла сваё рашэнне коратка і ясна: дэбіл ён. Пацыенты-жанчыны нярэдка на пытанне «Чаму вы выйшлі замуж за гэтага чалавека?» адказваюць нешта накшталт «ён нядрэнны», «лічыла, палюбіць — кіне піць» і г.д. Іншымі словамі, ніякага намёку на асабістыя якасці — тое, што мацуе стасункі на доўгія гады. Таму літаральна праз 4—5 гадоў сумеснага жыцця, калі «хімія кахання» вычэрпвае сябе, высвятляецца, што гэтых абаіх нічога не звязвае.

У ідэальным варыянце муж, калі хочаце, павінен быць бліжэй за маці, кажа Дзмітрый Зіноўевіч.

Мужчына і жанчына — розныя, і функцыі ў іх, зразумела, розныя. Нежаданне прыняць гэту ісціну нараджае канфлікт. Шлях размяркавання абавязкаў, патрабаванні, прымушэнні, папрокі сведчаць пра тое, што матывацыя падчас заключэння шлюбу была... скажонай. Паколькі не было сапраўднага кахання, якое, як вядома, грунтуецца на жаданні зрабіць прыемнае іншаму, а не вырваць што-небудзь для сябе. Каханне — гэта «я хачу зрабіць для цябе», а не «ты мне павінен». Жыць, як кажуць мудрыя людзі, трэба з асобай, а многія жывуць з целам. Адсюль і праблемы, у тым ліку сэксуальнага характару.

Дарэчы, сэксуальныя праблемы ў аднолькавай ступені ўласцівыя і жанчынам, і мужчынам. І закранаюць апошнія не толькі цела, але і псіхалагічны аспект, з-за чаго падобныя станы цяжэй усведамляюцца і складаней лечацца. Звяртаюцца ж да айчынных сэксолагаў у большай ступені ўсё ж такі мужчыны. Проста яны ў інтымным працэсе — слабае звяно. Ці, як кажа спадар Капусцін, імітаваць эрэкцыю складаней, чым аргазм. Жанчыны ж часцяком — звяно маўклівае. Галоўнае — каб заробак прыносіў, каб у дзяцей быў хоць такі бацька, абы адчапіўся. Або — са знакам «ахвярнасці», напрыклад, яму добра, значыць, і мне хораша. А між тым у кожнай жанчыны — свая мелодыя, і калі жанчына не хоча раскрывацца ў інтымным працэсе, мужчына можа гадамі «іграць» свае «падмаскоўныя вечары» і не намацаць тую адзіную мелодыю, якая і патрэбна яго партнёршы.

У дысгарманічных парах можна гаварыць пра адсутнасць даверу адно да аднаго. Аб адсутнасці глыбокіх пачуццяў сведчаць, напрыклад, і каструючыя паводзіны, якія практыкуюць, згодна з замежнымі звесткамі, 30 працэнтаў жанчын. «Яны паводзяць сябе так, што нават нармальны мужчына не ў стане выканаць свой абавязак, — кажа Дзмітрый Капусцін. — Ёсць, вядома, самцы, якім усё адно, з кім і як. Важна здаволіцца і ў цішыні пачуць, як разам з ёю нарэшце ад'язджае ліфт...» Аднак многія хацелі б і даверлівых, і шчырых адносін, а ў адказ — неасцярожнае, жорсткае, крыўднае слова, пасля якога стрэлкі гадзінніка апускаюцца строга ўніз. Абразлівыя словы могуць адбіць ахвоту не тое што на адзін вечар, а нават на доўгія гады.

Наогул лібіда абуджаецца, калі чалавек, што называецца, сыты і спакойны. А ў стане стрэсу яно хаваецца. Прыгадайце свой псіхічны стан за 20 хвілін да экзамену. Ці да сэксу вам было ў гэты момант? Вось-вось... Спачатку здаць, а потым — адарвуся.... А калі чалавек жыве ў стане пастаянных нервова-псіхічных нагрузак, сэкс адыходзіць на дваццаць пяты план. На жаль, жанчыны не спрабуюць расслабляць сваіх мужчын, заахвочваць да сэксуальных адносінаў. А між тым, да жанчыны аргастычныя перажыванні могуць вярнуцца пасля якога заўгодна перапынку. Мужчына ж не павінен сыходзіць з дыстанцыі ніколі. Парушэнні графіку пагражаюць незваротным знікненнем патэнцыяльных магчымасцяў. Спадар Капусцін кажа, што не старэе толькі той мужчына, які... эякулюе. Прычым хоць бы і ў халастую.

На практыцы ж нярэдка мае месца такая сітуацыя. Па той ці іншай прычыне ў мужчыны ўзнікае, скажам, зніжэнне патэнцыі. І ў тыя рэдкія разы інтымнай блізкасці (з жонкай ці не абавязкова) ён ідзе па самым простым шляху — ужывае прэпарат накшталт віягры. Дарэчы, у нашай краіне зараз каля 15 найменняў падобных лекаў — з рознымі камерцыйнымі назвамі, але прыкладна аднолькавай хімічнай формулай. Прэпарат гэты мае свае пабочныя эфекты, але і добры асноўны. Праблема ж у тым, што гэта — часовая дапамога, і вырашэнню асноўнай праблемы ніяк не спрыяе.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ГІТАРА РАЗЛАДУ

У Магілёве вечарам маладыя музыканты завяршылі рэпетыцыю ў кінатэатры «Космас» і выйшлі з будынка ў сквер. Аднак чымсьці не спадабаліся двум хлопцам, адпачываўшым на лаве. Завязалася бойка, якая завяршылася адабраннем электрагітары ў 19-гадовага музыкі. Хуліганамі былі навучэнец прафесійна-тэхнічнага ліцэя і вучань 11 класа, іх затрымалі, распачата крымінальная справа.

**Алена КАЗЛОВА.**

**Паритетбанк**

ОАО «Паритетбанк» г. Минск, ул. Гамарника, 9/4

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2009 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2009 | 01.10.2008 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 9 488,0 | 6 104,9 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 40 347,2 | 33 867,3 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | 10 619,3 | 36 735,5 |
| | для торговли | 11031 | — | — |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | — | — |
| | в наличии для продажи | 11033 | 10 619,3 | 36 735,5 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 102 943,1 | 20 898,3 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 264 308,7 | 179 287,4 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 16,0 | — |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 20 790,9 | 14 870,5 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 5 677,9 | 6 277,7 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | 454 191,1 | 298 041,6 |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 100 000,0 | 55 000,0 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 126 778,1 | 55 830,4 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 101 005,9 | 66 535,5 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 4 952,6 | 10 320,6 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 5 919,0 | 3 443,9 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 338 655,6 | 191 130,4 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 93 368,4 | 93 368,4 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | — | — |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 1 555,9 | 964,3 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 13 767,6 | 8 402,7 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 6 843,6 | 4 175,8 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 115 535,5 | 106 911,2 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 454 191,1 | 298 041,6 |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 208 945,1 | 175 087,9 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 99 159,8 | 74 221,9 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2009 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2009 | 01.10.2008 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 35 012,0 | 20 800,0 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 17 826,0 | 7 676,2 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 17 186,0 | 13 123,8 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 3 953,2 | 3 273,7 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 362,1 | 162,4 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 3 591,1 | 3 111,3 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 5 015,9 | 1 279,4 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 107,2 | (-86,3) |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | — | — |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 2 870,7 | 867,5 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 1 566,6 | 1 150,5 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 14 612,4 | 12 061,1 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 3 107,6 | 929,5 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 509,6 | 719,5 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 6 366,5 | 4 001,1 |

**Председатель Правления** **С.Л. Панковец**

**Главный бухгалтер** **М.М. Абраменко**

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 27.10.2006 г. № 5. УНП 100233809.

